Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

N35
1933.

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

НАДЗЯ АСТАШКО—ударніца Віцебскай швейнай фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі", за перавыкананне норм і ўзорную якасць тры разы прэміявана, арганізатар маладзёжнай істужкі, лепшая ўдарніца па аўладанню тэхнікі, член бюро цэхавай комсомольскай ячэйкі. Да 15-годдзя ВЛКСМ узнагароджана ордэнам Леніна.

1934 г. павінен быць і будзе годам высокай якасці прадукцыі

Аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай прадукцыі

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Не гледзячы на няўхільны рост прадукцыі дзяржаўнай прамысловасці і дасягнутыя поспехі ў аўладанні новай тэхнікай, да гэтага часу не зжыты злачынна-нядбайныя адносіны да якасці выпускаемай прадукцыі з боку кіраўнікоў паасобных прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый. Выпуск нядобраякасных або неўкамплектаваных машын, а таксама выпуск нядобраякасных дэталяй і матэрыялаў з боку сумежных заводаў наносіць істотную шкоду дзяржаве. Асабліва нецярпім і злачынен выпуск нядобраякасных і некамплектных вырабаў прадпрыемствамі, працуючымі на патрэбы абароны краіны.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР, разглядаючы выпуск нядобраякаснай і некамплектнай прадукцыі, як цяжкае процідзяржаўнае злачынства, і, прызнаючы неабходным узмацненне адказнасці за выпуск нядабраякаснай прадукцыі, — у змяненне сваёй пастановы ад 23 лістапада 1929 года (З. З. 1930 г. № 1, арт. 9), пастанаўляюць:

1. Устанавіць, што кіраўнікі трэстаў, дырэктары прадпрыемстваў і асобы адміністрацыйна-тэхнічнага персанала, вінаватыя ў выпуску нядобраякаснай і некамплектнай прадукцыі, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці з прымяненнем меры судовай рэпрэсіі — пазбаўлення волі на тэрмін не ніжэй 5 год.

2. Даручыць пракуратуры Саюза ССР забяспечыць няўхільнае правядзенне ў жыццё данай пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР В. МОЛАТАЎ (Скрабін).

Москва, Крэмль, 8 снежня 1933 года.

З ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА ЦК КП(б)Б

аб ходзе загатовак ільну і калгасным будаўніцтве

Па пытаннях калгаснага будаўніцтва—падкрэсліваючы нездавальняючы стан работы па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў у БССР (падрыхтоўка кадраў, умацаванне вытворчай брыгады, звяна, пытанні прадукцыйнасці працы, дысцыпліны, норм выпрацоўкі, размеркаванне даходаў і г. д.) і як вынік — недастатковая работа па арганізацыі новага прыліва ў калгасы, а таксама рад прарываў (па рамонту трактараў, засыпцы насенных і страхавых фондаў, па выкананню дырэктывы ЦК ВКП(б) аб цёлках для бескароўных калгаснікаў, становішча кадраў у калгасе) — прыняць дадатковую суму канкрэтных практычных мерапрыемстваў, забяспечваючых ўжо ў снежні месяцы рашучы пералом у гэтых важнейшых работах, забяспечваючы гэтым самым найбольш паспяховае чым калі-б там ні было правядзенне веснавой сяўбы 1934 года.

Па засыпцы-ж насенных і страхавых фондаў работа павінна быць скончана не пазней 15 снежня.

Пры засыпцы важнейшай справай лічыць выкананне поўнасцю плана засыпкі добраякаснага высокагатунковага насення аўса, ільну, яравой пшаніцы.

Работніцы, жонкі рабочых, калгасніцы, працоўныя аднаасобніцы!

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВАЮ ЧАСОПІСЬ

„Работніца і калгасніца Беларусі“

ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЧАСОПІСЬ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 12 месяцаў	. . . . .	2 руб. 40 кап.
„ 6 „	. . . . .	1 „ 20 „
„ 3 „	. . . . .	— „ 60 „
„ 1 „	. . . . .	— „ 20 „

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў

ЗА ЛЕНІНСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПАЛІТЫКУ

З ПАСТАНОВЫ ПЛЕНУМА ЦК КП(б)Б

АБ ЗАДАЧАХ ПЕРАВЫБАРАЎ ПАРТОРГАНАЎ

Г. Н. Б-ка Ср. Аз.

3. БССР, раней прыгнечаная царызмам калонія з адсталай сялянскай гаспадаркай і найбольш жорсткай эксплаатацыяй памешчыкамі сялянства, меўшая выключна слаба развітую прамысловасць, зруйнаваная і спустошаная сусветнай вайной і інтэрвенцыяй у рэзультаце 16 год пераможнай барацьбы і работы на ўсіх ўчастках соцыялістычнага будаўніцтва—рабочых, калгаснікаў, працоўных Беларусі—пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б), непасрэдных указанняў правадыра партыі тав. Сталіна, няўхільна правадзімых КП(б)Б, выходзіць на адно з першых месц у радзе рэспублік і абласцей Совецкага Саюза.

Рад новых буйнейшых прадпрыемстваў пушчаны ў эксплаатацыю за гэты час (Белдрэс, фабрыка штучнага шоўка, „Большэвік", „КІМ", Бабруйскі камбінат, Гомсельмаш, цэментны завод, шкляны завод і інш.).

Існаваўшыя раней прадпрыемствы, па сутнасці саматужныя майстэрні,—падвяргаліся карэннай тэхнічнай рэканструкцыі і сталі буйнымі механізаванымі прадпрыемствамі (завод імя Варашылава, „Комунар", „Чырвоны металіст", Добрушская фабрыка і рад інш.).

На зусім новай механізаванай аснове разгорнута здабыча і перапрацоўка торфа. Занова развілася вытворчасць фасфарыта і будматэрыялаў.

Перамагаючы пакінутую ў спадчыну ад мінулага фактычную няроўнасць—прамысловасць БССР гіганцкі вырасла, значна перавысіўшы (у два разы) тэмпы роста прадукцыі прамысловасці Совецкага Саюза і, прыкладна, у 10 раз перавысіўшы аб'ём вытворчасці прамысловасці ў дарэволюцыйнай Беларусі.

Выраслі і мацнеюць кадры мясцовага нацыянальнага пролетарыята (беларускага, яўрэйскага): у прамысловае будаўніцтва ўліліся аграмадныя масы рабочых з беларускай вёскі; удзельная вага беларусаў у складзе рабочых буйнай прамысловасці вырасла з 21 проц. у 1929 годзе да 62 проц. у 1933 годзе; яўрэйскіх рабочых—з 14 проц. да 25 проц. Таксама павялічылася ўдзельная вага пролетарыята ў гарадскім насельніцтве рэспублікі—з 11 проц. у 1926 годзе да 20 проц. у 1932 годзе. Значна узрос удзел жанчын у вытворчасці—з 22 тысяч у 1927 годзе да 38 тысяч у 1932 годзе.

Соцыальна-эканамічны твар беларускай вёскі карэнным чынам змяніўся: калектывізавана 52 проц. сялянскіх гаспадарак, гаспадарча мацнеюць і тэхнічна ўзбройваюцца саўгасы, ліквідавана ў асноўным кулацтва, як клас. Каля 3 з паловай тысяч трактараў МТС і саўгасаў, складаныя сельгасмашыны і навуковая арганізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці—сёння аснова гаспадарчага развіцця і соцыялістычнай вытворчасці беларускай вёскі. Арганізацыя партыяй палітаддзелаў МТС і соўгасаў і ў БССР—стварыла рашучы пералом у справе ўмацавання калгасаў, соўгасаў на аснове новых соцыялістычных форм працы, павышэння якасці работы. Ужо ў гэтым годзе, ажыццяўляючы лозунг правадыра партыі тав. Сталіна—зрабіць калгасы большэвіцкімі і калгаснікаў заможнымі—мы маем рашучы ўздым гаспадарчага стана як калгасаў, так і соўгасаў, а таксама павышэнне матэрыяльнага дабрабыта калгасаў і калгаснікаў.

Агульны гаспадарчы і палітычны рост БССР, прывёўшы на аснове правядзення ленінскай нацпалітыкі да перамогі, росквіта совецкай нацкультуры, суправаджаўся далучэннем да гэтай культуры—нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу мільёнаў сялян і рабочых. У БССР поўнасцю ліквідавана непісьменнасць; створана сетка беларускіх школ з ахопам каля мільёна вучняў. Дасягнуты аграмадныя поспехі ў справе развіцця навукі, літаратуры і мастацтва. Мацнеюць і якасна ўдасканальваюцца культурныя навуковыя кадры.

4. Разгорнутае соцыялістычнае наступленне, палітыка суцэльнай калектывізацыі і на аснове яе ліквідацыя кулацтва, як класа, выкарчоўванне апошніх карэнняў капіталізма ў горадзе і на сяле—натыкаюцца на адчайнае супраціўленне буржуазна-нацыяналістычных элементаў у Беларусі, якія змагаюцца за захаванне прыватнай уласнасці, мараць аб рэстаўрацыі капіталізма.

Факты выкрытага контррэволюцыйнага шкодніцтва ў Наркамземе, ліквідацыя кулацкага саботажа ў справе выканання абавязацельстваў перад дзяржавай па загатоўках з пранікненнем у кіруючыя органы калгасаў, МТС—класавага ворага, контррэволюцыйныя нацдэмаўскія вылазкі ў Менбудканторы, Упаўнаркамсоўгасаў, Беларускай Акадэміі Навук, у друку, у літаратуры, у мастацтве, пранікненне класава-чужых нацдэмаўскіх элементаў у органы Наркамасветы, справа Сцяпуры—з усёй нагляднасцю паказваюць, што класавы вораг праводзіць новую тактыку і на ўчастку правядзення ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтую новую тактыку класавага ворага на нацыянальным участку нашай большэвіцкай барацьбы КП(б)Б праглядзела і своечасова не ўскрыла ўзмоцненага пранікнення беларускіх контррэволюцыйных нацыяналістычных элементаў у розныя совецкія, зямельныя, культурныя органы і нават партыйныя арганізацыі ў мэтах прамога шкодніцтва і контррэволюцыйнага сабатажа мерапрыемстваў партыі і совецкай улады. Гэта магло быць толькі ў рэзультаце аслаблення большэвіцкай пільнасці з боку партыйных арганізацый, папушчэння, а часамі і пры простай і непасрэднай садзейнасці некаторых „комуністаў", заражоных нацыянал-ухілісцкім духам.

Яшчэ у снежні 1932 года ЦК ВКП(б) сваімі пастановамі аб загатоўках у Беларусі і па справе Сцяпура папярэдзіў КП(б)Б аб неабходнасці ўзмацнення барацьбы са славесна-дэкларацыйнымі

С-АГПБ

адносінамі комуністаў да правядзення генеральнай лініі партыі, і узмоцненай барацьбы з гніла-пераражэнцкімі элементамі ў партыі, скрозь і ўсюды прыкрываючымі сваю антысовецкую работу фальшыва-нацыянальным сцягам, а таксама аб неабходнасці разгарнуць сапраўды большэвіцкую барацьбу за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізма, маючы на ўвазе рад фактаў патурання з боку беларускіх партыйных і совецкіх арганізацый—буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям.

Пленум лічыць, што таксама як і на Украіне—у Беларусі буржуазныя нацыяналісты пад фальшывым сцягам беларусізацыі, пры патуранні ў радзе выпадкаў буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям з боку партыйных і совецкіх арганізацый—праводзілі сваю шкодніцкую контррэволюцыйную работу (факты прымусовай беларусізацыі, скажэнне, ламанне беларускай мовы, свядомае засмечанне яе польскімі і чэшскімі словамі, вытручванне агульных з рускай мовай слоў, насаджэнне ў культурныя і навуковыя ўстановы шкодніцкіх нацыяналістычных элементаў), дабіваючыся адрыва Беларусі ад Совецкага Саюза з тым, каб ператвараць яе ў калонію імперыялістаў і пасадзіць на шыю калгаснікаў і працоўных Беларусі польскіх і нямецкіх памешчыкаў і капіталістаў.

Выходзячы з вышэйпаказанага, пленум ЦК КП(б)Б лічыць пастанову пленума ЦК КП(б)У аб неабходнасці ўзмацнення работы па інтэрнацыянальнаму выхаванню мас на аснове неаслабнай барацьбы на два фронты—вялікадзяржаўнага рускага шавінізма і мясцовага нацыяналізма, на аснове сапраўднага забеспячэння большэвіцкім партыйным кіраўніцтвам будаўніцтва соцыялістычнай культуры—цалкам адказваючым задачам работы ўсёй КП(б)Б па нацыянальнаму пытанню.

Пленум ЦК КП(б)Б—таксама як гэта падкрэслiў і пленум ЦК КП(б)У,—лічыць, што вялікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага Саюза і ўсёй ВКП(б), але што гэта ні ў якай ступені не супярэчыць таму, што ў даны момант у Беларусі галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы беларускі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі. Неабходна асабліва мець на ўвазе новую тактыку рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў і беларускіх нацыяналістаў, падтрымліваемых усёй контррэволюцыяй, у тым ліку і трацкістамі, якія на цяперашнім этапе блакуюцца паміж сабой на агульнай платформе адрыва БССР ад СССР для аслаблення пазіцый СССР і узмацнення пазіцый капіталізма.

5. Факты контррэволюцыйнай, дыверсійна-шкодніцкай работы нацыяналістычных элементаў Беларусі, падтрымліваемых міжнароднай буржуазіяй і ў першую чаргу фашыстамі, з асаблівай сілай падкрэсліваюць неабходнасць для ўсёй КП(б)Б, усіх рабочых, калгаснікаў і працоўных Беларусі, якая непасрэдна мяжуецца з капіталістычным светам—яшчэ больш мацаваць абарону краіны советаў, узнімаць на вышэйшую ступень баявую і палітычную падрыхтоўку нашай Чырвонай арміі, маючы на ўвазе, што капіталістычны свет, раз'ядаемы нечуваным крызісам і абвастрэннем усіх супярэчнасцяй капіталізма, перад тварам гіганцкага роста Совецкага Саюза, роста барацьбы пролетарыята за сусветную пролетарскую рэволюцыю, прабуе знайсці выхад са створанага становішча на шляхах новых імперыялістычных войн і перш за ўсё супроць СССР.

6. Да XVII з'езда ВКП(б) КП(б)Б ідзе з радам буйнейшых дасягненняў як у галіне прамысловасці, навукі, літаратуры, мастацтва, так і ў асаблівасці ў галіне сельскай гаспадаркі.

Гэтых поспехаў КП(б)Б дабілася ў рашучай барацьбе супроць апартунізма справа і злева, у барацьбе з гнілымі пераражэнцкімі элементамі, элементамі групаўшчыны і месніцтва, жалезным згуртаваннем сваіх радоў і ўмацаваннем адзінства і баяздольнасці партыі, у асаблівасці дзякуючы прамой і непасрэднай дапамогі ЦК ВКП(б), правадыра партыі тав. Сталіна, указаўшых КП(б)Б на буйнейшыя прарывы і недахопы як у справе выканання абавязацельстваў перад дзяржавай (снежань 1932 г.—сельгасзагатоўкі), так і ў правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі (студзень 1933 года—справа Сцяпура).

КП(б)Б на аснове разгорнутай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі памылак і недахопаў у рабоце згуртавала яшчэ больш свае рады і, мабілізаваўшы працоўных, рабочых і калгаснікаў, здолела дабіцца рашаючых поспехаў ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва.

Указанне ЦК ВКП(б) аб неабходнасці ўзмацнення барацьбы са славесна-дэкларацыйнымі адносінамі комуністаў да правядзення генеральнай лініі партыі, узмацнення барацьбы з гніла-пераражэнцкімі элементамі, скрозь і ўсюды прыкрываючымі сваю работу фальшыва-нацыянальным сцягам, а таксама ўказанне на тое, што беларускія совецкія партыйныя арганізацыі не вялі большэвіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізма, а ў радзе выпадкаў патуралі кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям (справа Сцяпуры) і праведзеная чыстка радоў КП(б)Б спрыялі ачышчэнню радоў беларускай партыйнай арганізацыі ад шкурнікаў, пераражэнцаў з партбілетам у кішэні, гнілых лібералаў, здраджваючых справе партыі, людзей, страціўшых партыйны твар і большэвіцкую пільнасць, ад усіх простых і ўскосных дапаможнікаў класавага ворага. Чыстка КП(б)Б ачысціла рады партыйных арганізацый ад класава-чужых, класава-варожых людзей і баласта. Усё гэта яшчэ больш згуртавала большэвіцкія рады КП(б)Б вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і правадыра партыі тав. Сталіна, умацавала яе баяздольнасць і забяспечыла КП(б)Б узмацненнем шырачайшай сувязі з працоўнымі масамі Беларусі.

ПРАВІЛЬНАЯ ЛЕНІНСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА, ПРАВАДЗІМАЯ ПАРТЫЯЙ, ЗАБЯСПЕЧЫЛА НАМ ВЕЛІЗАРНЕЙШЫЯ ПОСПЕХІ НА ФРОНЦЕ СОЦЫАЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР.

Гарачае большэвіцкае прывітанне вернаму дапаможніку партыі комсомолу Беларусі—у дзень яго слаўнага пятнаццацігадовага юбілею

XV ГАДАВІНА ЛКСМБ

Гісторыя ЛКСМБ непарыўна звязана з гісторыяй ВЛКСМ. Ленінскі комсомол вядзе барацьбу і перамагае пад кіраўніцтвам ВКП(б) і геніальнейшага правадыра партыі і сусветнага пролетарыята, лепшага ленінца тав. Сталіна.

Гісторыя комуністычнага маладзёжнага руху на Беларусі з усёй яскравасцю сведчыць, што комуністычная партыя Беларусі, як неадрыўная частка сталёвых радоў ВКП(б) з'явілася арганізатарам і кіраўніком рэволюцыйнага юнацкага руху па Беларусі. Аб гэтым сведчаць рашэнні Усебеларускай партканферэнцыі, у якіх адзначаецца: „Работа ў комуністычным саюзе моладзі з'яўляецца аднэй з важнейшых партыйных работ". Гэта было пачаткам таго, калі ўсе мясцовыя партарганізацыі ўзяліся за вялікую справу — арганізацыю комсомола на месцах.

У Менску комсомольская арганізацыя ствараецца 15 снежня 1918 года. Пасля Менска пачынаюць арганізоўвацца комсомольскія ячэйкі на месцах. Ствараецца комсомольская арганізацыя ў Бабруйску, Мозыры і ў іншых гарадах. Толькі дзякуючы Кастрычніцкай рэволюцыі і ўстанаўленню совецкай ўлады па Беларусі адкрылася велізарная магчымасць для шырокага комуністычнага руху рабочай і бядняцка-сялянскай моладзі БССР.

Ленінскі комсомол Беларусі да 15 гадавіны свайго існавання прыходзіць з цэлым радам буйнейшых поспехаў на ўсіх франтах нашай вялікай соцыялістычнай будоўлі. Шлях ЛКСМБ—шлях барацьбы большэвіцкага маладняка з рознымі дробна буржуазнымі і буржуазнымі нацыяналістычнымі арганізацыямі, як напрыклад „Югенбунд", „Еўкомол", „Вучнёўская грамада" і інш., якія праводзілі контррэволюцыйную работу, былі падгалоскамі розных контррэволюцыйных партый і арганізацый. У барацьбе з контррэволюцыйнымі варожымі арганізацыямі моладзі рос і загартоўваўся комсомол.

Комсомольская арганізацыя пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі вядзе рашучую барацьбу супроць контррэволюцыйнай дзейнасці нацыяналістычных арганізацый. Нацыяналістычным тэорыям, комсомол супроцьставіў пролетарскі інтэрнацыяналізм—збліжэнне пролетараў і паўпролетараў розных нацыянальнасцяй для сумеснай барацьбы за пабудову соцыялізма. Комсомол праводзіць велізарную работу па ўцягненню у свае рады тэй часткі маладых рабочых, якія да гэтага часу былі пад уплывам нацыяналістычных арганізацый.

Комсомол Беларусі сваім удзелам у грамадзянскай вайне паказаў, што ён можа гераічна адстойваць сваю соцыялістычную бацькаўшчыну.

У час нямецкай і польскай акупацый комсомол не спыняе сваёй барацьбы ў падполлі за дыктатуру пролетарыята.

Толькі дзякуючы барацьбе за выкананне асноўных лозунгаў партыі, на ўсіх этапах свайго гістарычнага развіцця, толькі дзякуючы адданай барацьбе за генеральную лінію партыі супроць контррэволюцыйнага трацкізма, супроць правага і „левага" ухіла супроць гнілога лібералізма, у барацьбе з вялікадзяржаўнымі шавіністамі і мясцовымі нацыяналістамі, якія вядуць сваю антысовецкую работу пад фальшыва-нацыянальным сцягам, комсомол, як верны дапаможнік партыі, прыходзіць да свайго XV гадовага юбілея згуртаваным вакол сваёй большэвіцкай партыі, вакол яе цэнтральнага камітэта.

„Комсомол—гэта ёсць масавая арганізацыя рабочай і сялянскай моладзі, арганізацыя не партыйная, але блізка прымыкаючая да партыі ў справе выхавання маладога пакалення ў духу соцыялізма Яна дае маладыя рэзервы для ўсіх астатніх масавых арганізацый пролетарыята па ўсіх галінах кіраўніцтва. Саюз моладзі набыў асаблівае значэнне пасля ўмацавання дыктатуры пролетарыята, у перыяд шырокай культурнай і выхаваўчай работы пролетарыята". (*Сталін І. В.—„Аб комсомоле"*).

І комсомол Беларусі, як сустаўная частка ВЛКСМ, гэта баявая комуністычная арганізацыя моладзі, якая працуе пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі над выкананнем задач соцыялістычнага будаўніцтва ў краіне, стала сапраўды масавай школай рознастайнай дзяржаўнай дзейнасці. Няма ніводнай галіны гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, дзе б комсомол не адыгрываў рашаючай ролі і недарма комсомол узнагароджан ордэнам чырвонага працоўнага сцяга.

Комсомол павінен—па-комуністычнаму выхоўваць пакаленне маладых рабочых і сялян у духу баявой непрымірымасці да класавага ворага, у духу самаадданай барацьбы за выкананне указанняў нашай партыі. „Быць членам Саюза моладзі—значыцца весці справу так, каб аддаваць сваю работу, свае сілы на агульную справу. Вось у гэтым заключаецца комуністычнае выхаванне. Толькі ў такой рабоце ператвараецца малады чалавек, або дзяўчына ў сапраўднага комуніста". (*Ленін—„Задачы саюзаў моладзі"*).

Да XV гадавіны свайго існавання комсомол Беларусі прышоў, як ніколі згуртаванай, адзінай маналітнай сям'ёй. Калі яшчэ не так даўно, у мінулым кіраўніцтве ЦК ЛКСМБ панавала беспрынцыпная групаўшчына, склока, то зараз мы маем, што „ЦК ЛКСМБ пасля абнаўлення кіраўніцтва ліквідаваў групаўшчыну, склокі, месніцтва, меўшыя раней месца ў актыве комсомола Беларусі, дабіўшыся згуртавання арганізацыі навакол правільнай палітычнай лініі".

(*З пастановы ЦК ВЛКСМ).*

Тав. Екельчык — комсомольскі ваенорг Менскай швейнай фабрыкі імя Крупскай, актыўная комсомолка, герой першай пяцігодкі.

Комсомол Беларусі як ніколі згуртаваўся вакол генеральнай лініі партыі і змагаецца за ажыццяўленне гаспадарча-палітычных дырэктыў партыі.

Чыстка партыі дапамагла комсомольскай арганізацыі Беларусі выкрыць новыя манеўры класавага ворага ў комсомоле і на гэтай аснове дала яшчэ большую магчымасць згуртаваць свае рады ў барацьбе з апартунізмам усіх колераў навокал генеральнай лініі партыі.

Комсомол Беларусі паказвае на радзе важнейшых участкаў нашай соцыялістычнай будоўлі, як у прамысловасці, так і у сельскай гаспадарцы, нацыянальна-культурным будаўніцтве, узоры сапраўднай большэвіцкай барацьбы за выкананне задач партыі.

У барацьбе за прамфінплан, правядзенне тэхнічнага экзамена, асваенне індустрыяльнай тэхнікі і тэхнікі абароны, мы маем шмат прыкладаў, калі комсомольскія ячэйкі і паасобныя комсомольцы паказваюць сапраўдныя ўзоры работы і займаюць вядучае месца ў барацьбе за выкананне і перавыкананне прамфінплана, за аўладанне тэхнікай машын, рацыяналізацыю і г. д. Шырацца рады ўдарнікаў, якія вядуць за сабой ўсю масу. Даволі прывесці некалькі прыкладаў, каб убачыць гэта.

Вось арматуршчыца Гамбург Маня (завод „Пролетарый", Гомель). Яе цэх меў рагожны сцяг. Цяпер-жа, дзякуючы сваёй ударнай рабоце, сістэматычнаму перавыкананню прамфінплана на 10—15 проц. тав. Гамбург дабілася таго, што яе цэх стаў перадавым, выконваючы прамфінплан на 105 проц. У сучасны момант тав. Гамбург працуе старшынёй цэхкома.

Аляцэвіч Ніна (фабрыка імя Клары Цэткін, Віцебск) выконвае прамфінплан на 113—115 проц. Яна працуе сакратаром ячэйкі і арганізоўвае беспартыйную моладзь на паспяховае выкананне прамфінплана.

Брыгада тав. Сулівонскага Б. (столяр завода імя Ланцуцкага, Гомель) выконвае прамфінплан у сярэднім на 130 проц. і неаднаразова прэміявалася. Сам тав. Сулівонскі прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце, з'яўляецца начальнікам „Л. К." і членам бюро комсомольскага калектыва.

Герой першай пяцігодкі Сідарава Кацярына (фабрыка „Дзвіна") і матальшчыца Калько Грыпіна (фабрыка імя Клары Цэткін) выконваюць прамфінплан на 125—130 проц.

Можна было-б такіх прыкладаў прывесці безліч, але і гэтых дастаткова для характарыстыкі таго, што комсомол заняў сапраўды пачэснае месца як у прамысловасці, так і ў калгасах і сваім прыкладам арганізоўвае вакол сябе беспартыйную рабочую і калгасную моладзь і выхоўвае яе ў комуністычным духу.

Шлях пройдзен вялікі, але наперадзе яшчэ вялікая работа. Неабходна яшчэ больш упарта змагацца за аўладанне тэхнікай, за новы стыль у рабоце, за тое, каб 1934 год стаў годам карэннага паляпшэння якасці прадукцыі, змагацца за выкананне лозунга правадыра партыі і рабочага класа тав. Сталіна—зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Падыходзячы да сваёй XV гадавіны, неабходна ўспомніць словы Леніна, які вучыў нас, што лепшым спосабам святкавання з'яўляецца сканцэнтраванне ўвагі на яшчэ невырашаных задачах.

Такой невырашанай задачай, вузкім месцам з'яўляецца слабая пастаноўка марксісцка-ленінскай вучобы на месцах, аб значэнні якой гаварыць не прыходзіцца. Даволі толькі ўспомніць словы Леніна, што „без рэволюцыйнай тэорыі не можа быць і рэволюцыйнага руху".

Неабходна яшчэ больш шырока разгарнуць самую жорсткую барацьбу з буржуазным нацыяналізмам, які служыць зброяй інтэрвентаў і буржуазных рэстаўрантаў. Вялікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца, як і раней, галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага саюза. Але гэта ні ў якай ступені не супярэчыць таму, што ў некаторых рэспубліках СССР, у тым ліку ў БССР, як і на Украіне, у даны момант галоўнай небяспекай з'яўляецца мясцовы, у БССР беларускі нацдэмакратызм і шавінізм, які злучаецца ў сваёй барацьбе супроць совецкай улады з імперыялістычнымі інтэрвентамі. Цэлы рад вылазак нацдэмакратызма гаворыць аб актывізацыі гэтага ворага.

Таму мы павінны паставіць ва ўсю шырыню задачы інтэрнацыянальнага выхавання. Кожны крок нашай штодзённай работы мы павінны ўвязаць з лёсам сусветнай пролетарскай рэволюцыі. Тав. Сталін гаварыў: „Трэба, каб дух інтэрнацыяналізма вітаў над комсомолам заўсёды. Трэба, каб поспехі, няўдачы ў барацьбе пролетарыята нашай краіны звязваліся ў свядомасці комсомольцаў з поспехамі і няўдачамі міжнароднага рэволюцыйнага руху. Трэба, каб нашу рэволюцыю навучыліся разглядаць комсомольцы не як самамэту, а як сродак і дапамогу для перамогі пролетарскай рэволюцыі ва ўсіх краінах". Наша работа па ўмацаванні бацькаўшчыны пролетарыята ўсяго света з'яўляецца першачарговым абавязкам ў справе інтэрнацыянальнага выхавання.

Ажгірэй.

У 1920 годзе комсомол Беларусі налічваў 1300 чалавек, у 1933 годзе ЛКСМБ вырас да 90-тысячнай магутнай арганізацыі, якая налічвае ў сваіх радах 29 тысяч дзяўчат.

На здымку: заняткі ў польскай нацыянальнай школе (Менск).

ВЫХАВАНАЯ КОМСОМОЛАМ

Зусім маленькай засталася Хая, калі памёр яе бацька. Не маючы сродкаў на выхаванне, матка аддае яе ў дзіцячы дом.

10 год пражыла маленькая Хая ў дзіцячых дамах. Будучы ў дзіцячым доме, Хая вучылася на загатоўшчыцу і ў 1928 годзе паступіла на абутковую фабрыку імя Кагановіча. Ніхто асаблі-ва не заўважыў гэту бадай заўсёды маўклівую дзяўчынку—комсомолку, якая працавала на трэцім разрадзе па строчцы саюзак.

Ёю ніхто не цікавіўся і яна нічым не цікавілася. Бывала падыйдзе да яе сакратар ячэйкі і скажа: „Тав. Тэйтэльман, заўтра-ж палітгурток—прыходзь". А яна ў адказ—„навошта мне ваш палітгурток. Я лепш пайду пагуляю".—Так яна адпіралася ад кожнай работы, якая ёй даручалася. Пасмяецца і ўцячэ. Некаторыя з бюро комсомольскай ячэйкі патрабавалі выключэння яе з комсомола:—баласт, на палітзаняткі не ходзіць, комсомольскіх абавязкаў не выконвае, якая-ж з яе комсомолка.

— Пагарачыліся і досыць,—бывала супакойвае іх сакратар калектыва тав. Новасельскі. Гэту дзяўчыну трэба выхоўваць, а не выкідаць. Яна-ж не варожая нам, а толькі яшчэ несвядомая.

Было даручана сакратару цэхячэйкі Грыпштейну (лепшы сакратар на фабрыцы) узяць шэфства над Хаяй.

Грыпштэйн даручыў ёй невялікую работу па культ-бытавому сектару—размеркаваць атрыманыя талоны на бялізну. Хая ахвотна і добра выканала гэту работу. Потым ёй даручылі фінработу,—яна і тут справілася.

На фабрыцы арганізоўваецца драмгурток. Туды прыцягнулі і Хаю. Адначасова выбралі яе культработнікам цэхячэйкі. Даручылі канкрэтную работу, сачыць, каб комсомольцы добра наведвалі і не зрывалі палітзаняткаў, а таксама за якасцю гэтых заняткаў, і праводзіць чытку газет у часе абеда. Хаі даручылі якраз тую работу, якая яе цікавіла.

Зараз не пазнаць Хаі. З якім захапленнем яна праводзіць гучныя чыткі газет у час абедзенага перапынка, або распаўсюджванне аўтадораўскіх білетаў.

Хай паспрабуе хто не пайсці на палітзаняткі з яе ячэйкі. У яго, безумоўна, яна спытае чаму не прышоў і калі прычыны няўважлівыя адразу бяжыць да сакратара, перадаць аб зрыўшчыку вучобы. Сама-ж яна з'яўляецца лепшай ударніцай палітвучобы, актывісткай палітгуртка. Не было выпадка, каб яна не прышла, або спазнілася на вучобу.

Хая з'яўляецца душою і драмгуртка, яна вельмі любіць удзельнічаць у пастаноўках і ёй гэта добра ўдаецца. Таму Хаі заўсёды даюцца самыя адказныя, вядучыя ролі.

— Зараз я ўжо працую на шостым разрадзе і маю ўдарную кніжку за нумарам 141,—з гонарам заявіла яна,—а прамфінплан—замест 700 пар саюзак даю 900.

— Тэйтэльман зараз з'яўляецца прыкладам у ячэйцы. Яна ў нас лепшая з лепшых і па выкананні прамфінплана, і па якасці прадукцыі, па вучобе, дысцыпліне, адным словам, гэта наш гонар, мы яе выхавалі,—закончыў сваю прамову Новасельскі, а пасля дабавіў—значыць я быў праў.

Хая два разы прэміявана: адзін раз да Кастрычніцкіх свят—за поспехі ў выкананні прамфінплана, а другі раз за актыўную работу ў гуртку першай дапамогі. Зараз тав. Тэйтэльман вылучаюць на драматычныя курсы.

К.

Менск.

Комсомольская брыгада перавыконвае прамфінплан

У капыльным цэху дрэваапрацоўчага камбіната „Камінтэрн" мы да XIX МЮД'а арганізавалі маладзежную комсомольскую брыгаду, амаль выключна з дзяўчат. Большасць з іх—новыя работніцы без ніякай кваліфікацыі. За кароткі час гэтыя работніцы аўладалі тэхнікай сваёй аперацыі. Цяпер брыгада лічыцца аднэй з лепшых на заводе і ў Барысаве. Мы маем лепшыя паказальнікі не толькі колькасныя, але і якасныя. Свой прамфінплан брыгада не толькі выконвае з месяца ў месяц, але і перавыконвае. Кастрычніцкі план выканан на 111 проц.

Паасобныя работніцы паказваюць сапраўдныя ўзоры работы. Тав. Фейгіна выконвае прамфінплан на 170—180 проц., брыгадзір тав. Бараноўская—на 120 проц., тав. Самцова—таксама на 120 проц.

Брыгада прымае актыўны ўдзел ва ўсіх грамадскіх арганізацыях завода. Усе ахоплены падпіскай на пазыку, маюць уклады ў ашчадкасу і ахоплены калектыўным страхаваннем.

Як мы дабіліся ўзорнай работы брыгады? Штодзённа праводзім пяціхвілінныя сходы, на якіх выяўляем недахопы і тут-жа прымаем меры да іх знішчэння. Кожны дзень на дошку брака вывешваем дрэнную прадукцыю і на чырвоную дошку прадукцыю лепшай якасці. На нашых сходах мы выяўляем бракаробаў і вядзем з імі жорсткую барацьбу.

т. Рубінштэйн.

Вялікую дапамогу ў барацьбе з бракам нам аказвае штодзёнка.

Цыля Рубінштейн.

Барысаў.

ПОЎНЫМ ВЫКАНАННЕМ КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ПЛАНАЎ ПА

Шырока разгорнутым соцспаборніцтвам, нормы трапання ільна

Ільнотрапальшчыцы дзяржыншчыны разгарнулі соцспаборніцтва

На раённы злёт калгасніц-ударніц па апрацоўцы ільна з'явілася 61 ударніца.

Была арганізавана выстаўка добрай і дрэннай ільнопрадукцыі калгасаў. Спецыяліст па ільну тав. Буры тлумачыў калгасніцам, як можна атрымаць з аднэй і тэй-жа трасты большы і меншы нумар валакна.

Выступаўшыя на злёце калгасніцы Клочка, з калгаса „Іскра", і Кулікоўская, з калгаса „Перамога", адзначылі, што праўленні іх калгасаў пытаннем апрацоўкі і здачы ільна не займаліся. Калі-б яны гэтым пытаннем занялісь, то можна было-б да гэтага часу ўжо выканаць большую частку плана здачы ільнопрадукцыі.

Калгасніцы калгаса „Перамога", Негарэльскага сельсовета, прывезлі чырвоны абоз з ільном. Валакно было дрэнна апрацаваным. Удзельніцы злёта ільнотрапальшчыцы ўказалі, што гэта прадукцыя для прамысловасці не добрая.

— Сорамна нам,—кажуць калгасніцы калгаса „Перамога" Торба і Даніловіч.—Мы павязем гэты лён назад, перааапрацуем яго і здамо не ніжэй 14 нумара.

На злёце выступілі сакратар райкома партыі тав. Дамброўскі і начальнік палітаддзела т. Кроль. Злёт абавязаўся змагацца за выкананне ў тэрмін планаў здачы ільнавалакна найлепшай якасці.

Тут-жа на злёце было заключана соцспаборніцтва паміж калгасніцамі. Перадавыя калгасы Добрынеўскага сельсовета абавязаліся дапамагчы буксірнымі брыгадамі адстаючым калгасам.

Наша задача — арганізаваць актыўнасць калгасніц на барацьбу за палепшанне апрацоўкі ільна, павышэнне прадукцыйнасці працы, за своечасовае выкананне сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы дабраякаснага ільнавалакна.

Жанорг РК КП(б)Б
Шыцькоўская.

Жанорг палітаддзела МТС
Яcінская.

Дзяржынскі раён.

Ліквідавалі абязлічку, устанавілі прагрэсіўна-прэміяльную здзельшчыну

Калгас „Асоавіяхім", Юравіцкага сельсавета, у гэтым годзе здае валакно дзяржаве лепшае, чым здаваў у мінулым годзе. Да 20 лістапада калгас апрацаваў і здаў 12 цэнтнераў валакна.

Гэтых поспехаў у ільноапрацоўцы калгас дабіўся дзякуючы правільнай арганізацыі працы і добрасумленнай рабоце трапальшчыц. У апрацоўцы ільна канчаткова ліквідавана абязлічка. Кожная трапальшчыца да свайго кулька прывязвае ярлычок, які дае магчымасць устанаўліваць, хто як працуе, як хто змагаецца за якасць валакна.

Акрамя гэтага ў калгасе ўведзена прагрэсіўна-прэміяльная аплата працы. Тым трапальшчыцам, якія выпрацоўваюць норму і дабіваюцца валакна 9 нумара, запісваецца па 1,5 працадзён, а тым, якія выканаюць норму і даб'юцца валакна 11 нумара, запісваецца 2 працадні.

Прэміяльная аплата нанесла руйнуючы ўдар па прагулах і спазненнях на работу з боку трапальшчыц і ўзняла прадукцыйнасць працы. Кожная трапальшчыца стараецца выйсці на работу раней і дабіцца таго, каб яе валакно было самага вышэйшага нумара. Трапальшчыцы Кузмінова Зося, Котава Наста, Башкірава Мар'я і Быхавец Ганна, якія ў мінулым годзе не выпрацоўвалі нормы і давалі валакно 6 нумара, зараз даюць валакно 9—11 нумара.

Прыкладу трапальшчыц калгаса „Асоавіахім" павінны наследваць усе трапальшчыцы Юравіцкага сельсовета.

Р. Канавалаў.

Полацкі раён.

Пяткевіч Алеся—лепшая ўдарніца па апрацоўцы ільна

Пяткевіч Алесю у калгасе ведаюць, як лепшую калгасніцу-ўдарніцу. У час ўборачнай яна прыкладам сваёй ударнай работы вяла за сабой усіх жанчын. Алеся не здае тэмпаў і ў апрацоўцы ільна. Яна раней за ўсіх прыходзіць на сушню, пільна праглядае, ці высах лён, ці пара мяць. У час трапання ільна Алеся не толькі сама імкнецца даць добрую якасць, але сочыць, каб усе жанчыны апрацоўвалі лён добраякасна.

Калгасніцы ганьбаць гультаёў і бракаробаў, як напрыклад Пяткевіч Зіну, якая куды маладзейшая за Алесю, а на работу выходзіць рэдка. А калі і выйдзе, то якасць яе работы нікуды нявартая.

Алеся ведае, што наш совецкі лён павінен быць лепшым у свеце, таму яна так ўдарна змагаецца за яго якасць.

Шмыгіна.

Уздзенскі раён, калгас Пролетары.

„Пільна сачыць за сартаваннем ільну, бо ад гэтага ў асаблівасці залежыць высокая нумарнасць валакна, і за тым, каб перад трапаннем лён адлежваўся па 8—10 гадзін.

ІЛЬНОВАЛАКНУ СУСТРЭНЕМ З'ЕЗДЫ КП(б)Б і ВКП(б)

буксірам адстаючых даб'емся павышэння і высокай якасці яго

Рабселькоркі ўключаюцца ў вытворчы паход імя XVII партз'езда

УШАЧЫ. Адбыўся раённы злёт рабселькораў, у якім прымалі ўдзел 500 лепшых рабселькораў-ударнікаў калгасаў. Да злёта рабселькоры арганізавалі чырвоныя абозы, якімі здадзена 11 тон высокаснага валакна, 13 тон трасты, 50 цэнтн. ільнонасення і 40 цэнтн. мяса. Акрамя гэтага, рабселькоры сабралі да злёта грошай на пазыцы „Другая пяцігодка" і па іншых плацяжах на 12 тысяч рублёў.

80 селькорак-ударніц, якія прысутнічалі на злёце, у абедзены перапынак прапрацавалі ліст калгасніц Совецкай МТС (Паўночна-Каўказскі край) да тав. Сталіна і ўзялі на сябе абавязацельствы па лепшай апрацоўцы ільна і разгортванні культпахода ў калгасах. Селькоркі-ўдарніцы звярнуліся з лістом да ўсіх жанчын раёна аб тым, каб да XVII партз'езда дабіцца паляпшэння культбытавых умоў калгаснікаў.

Рабселькоры-ўдарнікі ўключыліся ў вытворчы паход імя XVII з'езда ВКП(б) і ўзялі на сябе абавязацельства арганізаваць калгаснікаў і аднаасобнікаў на 100-проц. выкананне загатовак ільнавалакна, на сканчэнне мабілізацыі сродкаў па ўсіх плацяжах да 15 снежня, на лепшую падрыхтоўку да вясны, лепшы догляд за канём і ўсёй жывёлай і арганізацыю агратэхнічнай вучобы ў калгасах.

(БелТА).

Што атрымаў за ільнотрасту калгас імя Дзяржынск га

Калгас імя Дзяржынскага, Кушлікоўскага сельсовета, поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па ільну, здаўшы 553,5 цэнтнераў трасты 1,75—2 нумара. Пасля гэтага ў калгасе засталося яшчэ каля двух тон трасты для размеркавання сярод калгаснікаў. Але агульны сход калгасніц і калгаснікаў аднагалосна пастанавіў не размяркоўваць трасты і поўнасцю прадаць яе дзяржаве. 18 лістапада калгас імя Дзяржынскага здаў звышплана на Боркавіцкі ільназавод 1753 кгр. трасты 1,5 нумара.

За ўсю здадзеную трасту калгас імя Дзяржынскага атрымаў ад дзяржавы 98 цэнтнераў збожжа і многа розных промтавараў для калгаснікаў на 3765 рублёў.

Р. Канавалаў.

Полацкі раён.

РАЎНЯЦЦА ПА ЛЕПШЫХ

Калгас „Чырвоны Бобар" з'яўляецца перадавым у раёне, бо тут арганізавана, па ўдарнаму працуюць жанчыны. Лепшая ўдарніца Ляшкова Агапа — кіраўнік жаночага звяна—у спаборніцтве з звяном Бязмозгай Мар'і ўзяла пяршынство. Ніводнага прагула і спазнення ў яе звяне не было, якасць працы вельмі добрая. За прыкладную работу Агапу любяць усе жанчыны. На палявой рабоце яна выпрацавала 200 працадзён. Не адстаюць ад яе Гуськова Марынка, якая выпрацавала 187 дзён, Макарэвіч Марфа і яшчэ рад лепшых ударніц, якіх калгас прэміяваў па 5—10 працадзён.

А вось прыклад ілжэўдарніцы Бязмозгай Мар'я, кіруючы жаночым звяном, развальвала працдысцыпліну, часта сама спазнялася на работу, рабіла прагулы, за што яе знялі з кіраўніцтва звяна, вывелі са склада ўдарніц і аштрафавалі на 5 працадзён.

На 27 лістапада калгас здаў ужо 55 проц. ільнавалакна. Хоць лён значна пашкоджан іржой, але лепшая трапальшчыца Макарэвіч Марфа выпрацоўвае 9 нумар і натропвае ў дзень пяць кгр., тады як Бязмозгая Мар'я натропвае толькі тры фунты і тыя чацьвертага нумара.

На палявой рабоце і ў час копкі бульбы працавала звяно з 9 старух па 70—80 гадоў. Бязмозгая Ганна, маючы 85 год, працавала вельмі добра і прэміявана 5 працаднямі.

У гэтым годзе калгаснікі атрымаюць на працадзень значна больш, чымся ў мінулым: збожжавых—3½ кгр., бульбы—8 кгр., гароху—500 грам. Калгас засыпаў ужо ясельны фонд.

Бандарэнка А.

Крупскі раен.

Па-ўдарнаму апрацоўваць лён

Брыгада № 1 калгаса „Памяць Леніна", Цяпленскага сельсовета, першай у сельсавеце выканала план здачы дзяржаве ільносемя. Зараз па-ўдарнаму брыгада апрацоўвае лён.

Калгасніца Сяргейчык Альжбета з'яўляецца застрэльшчыцай соцспаборніцтва ў брыгадзе. Яе падтрымліваюць жанчыны-ударніцы: Саладуха, Волька, Шынкарык Аня і інш. Звяно жанчын - трапальшчыц у складзе Трасковіч Ульяны, Батуры Мані, Варапей Ліды і Клімчук Мані спаборнічае са звяном жанчын, якія мнуць лён. Якасць трапання добрая і нормы перавыконваюць у два разы.

А. Шмыгіна.

Уздзенскі раён.

Дабіцца нормы выпрацоўкі па трапанню не ніжэй 15—20 кілограм добраякаснага валакна ў дзень" (*з самаабавязацельств 1-га ўсебеларускага злёта жанчын-старшынь калгасаў*).

Вытворчым і культурным паходам сустрэнем з'езды ВКП(б) і КП(б)Б

Гаўроніна Волька, Майтак Марыля—ударніцы культпахода

20 лістапада палітаддзелам Плешчаніцкай МТС была праведзена культурна - бытавая канферэнцыя дзяўчат, на якой прысутнічала 65 дэлегатак.

Дэлегаткамі былі лепшыя ўдарніцы, большасць з якіх прэміяваны па 3—4 разы.

Канферэнцыя абавязалася разгарнуць масавы паход за культурнае жыццё. У адказ на ліст калгаснікаў калгаса „Новы шлях" дэлегаткі абавязаліся павесці барацьбу за чыстую, светлую і цёплую хату, за тое, каб зрабіць кожную хату культурным месцам для адпачынка пасля работы, за арганізацыю ў кожным калгасе культурнай бані, чытальні і радыё. Дэлегаткі абавязаліся выпісваць, чытаць і пісаць у палітаддзельскую газету і часопіс „Работніца і калгасніца Беларусі".

На канферэнцыі быў абвешчан па зоне дзейнасці МТС конкурс на лепшую чыстую хату.

Пасля канферэнцыі калгасы „КІМ" і імя Ланцуцкага, Завішэнскага сельсавета, уключыліся ў культпаход.

У калгасе імя Ланцуцкага была арганізавана праверка санітарнага становішча хат калгаснікаў. Жанорг палітаддзела, старшыня калгаса і прадстаўнік раёна разам з актывісткамі-калгасніцамі пачалі ўвечары 25 лістапада абход калгаснікаў па хатах. Увечары паспелі быць толькі ў двух хатах. Аднак чуткі аб абходзе абляцелі ўвесь калгас. Уражанне было надзвычайнае. Амаль ва ўсіх хатах былі мабілізаваны ўсе сілы для таго, каб за ноч прывесці хату ў самы прыгожы выгляд. Калі назаўтра камісія прышла да калгасніцы Гаўронінай Волькі, то яе хаты нельга было зусім пазнаць, бо за ноч яна паспела выклеіць яе і пад колер шпалераў прыбрала ложкі і стол. Двух дзяцей сваіх апранула ў чысценькую вопратку, якія, сустрэўшы камісію, сказалі: „мама казала—культурны паход".

Чыста, прыгожа і ў хаце Майтак Марылі—лепшай ударніцы калгаса. Падлога чыста вымецена, павуцінне знята, стол засланы белым абрусам.

Старанна памыла і прыбрала сваю хату калгасніца Філіповіч. Нават лісце хатніх кветак выцерла, пасыпала ў сенцах пяском. 7-гадовая яе дачка прасіла камісію: „вы адзначце, што не толькі мама працавала, але што і я ёй дапамагала".

Такі парадак быў амаль ва ўсіх хатах у калгасе імя Ланцуцкага. Выключэннем былі толькі хаты Маркевіч Волькі, Маркевіча Янкі, Юрчанкі, Каролік Насты, Гардон Алены.

На агульным сходзе калгасніц былі падведзены вынікі агляда. Тут-жа была арганізавана па ініцыятыве лепшай ударніцы-комсомолкі Мялешкі Ганны падпіска на часопіс „Работніца і калгасніца Беларусі". Падпісаліся на год усе 34 калгасніцы, якія прысутнічалі на сходзе.

Такі-ж агляд становішча хат быў праведзен і ў калгасе „КІМ". Там на ачыстку і прыбіранне хат былі мабілізаваны ўсе старыя і малыя. Асабліва добры парадак быў у калгасніцы Лявіцкай Альжбеты, Кавалёўскай Пятрусі, Лявіцкай Юзефы.

На сходзе калгасніц падагулілі вынікі агляда, абмеркавалі ход апрацоўкі ільна, гаварылі аб ліквідбезе. Да кожнай жанчыны, у якой ёсць дзіця, прымацавалі вучняў. Жанчыны падпісаліся на часопіс „Работніца і калгасніца Беларусі".

Калгасы „КІМ" і імя Ланцуцкага па санітарна-культурнаму становішчу жылля становяцца паказальнымі. У гэтыя калгасы палітаддзел наладжвае ў бліжэйшыя дні экскурсіі калгасніц другіх калгасаў.

Жанорг палітаддзела Плешчаніцкай МТС МАРЦІНКЕВІЧ.

У паход за культурнае жыццё

Палітаддзел совгаса „Харомцы", разгортваючы культурна - бытавы паход, абвясціў конкурс на лепшую чыстую кватэру. У конкурс ўключыліся работніцы і хатнія гаспадыні совгаса.

Быў арганізован суботнік па барацьбе з брудам. У час суботніка ацяплілі столь у інтэрнаце, падмялі смецце вакол яго, набылі аптэчку і вешалку.

Пры клубе будзе арганізавана чырвоная і чорная дошка, куды будуць заносіць лепшыя па санітарыі кватэры і горшыя.

Работніцы і хатнія гаспадыні абавязаліся ў час конкурса дабіцца, каб у кожнай хаце была чыстая падлога, чыстая пасцель, знішчыць тараканаў, прусакоў і інш. шкоднікаў.

На прэміяванне лепшых удзельнікаў конкурса вызначан патэфон і шмат іншых рэчаў.

Гр. Круглоў, Міх. Станкевіч.

Глускі раён.

Бескароўных калгаснікаў больш не будзе

Праўленне калгаса „1-е мая", прапрацаваўшы пастанову ЦК ВКП(б) і ўрада аб дапамозе бескароўным калгаснікам, пастанавіла выдаць 7 лепшых цёлак калгаснікам на гадоўлю. Цёлак атрымалі лепшыя ўдарніцы — Гарбунова Сцепаніда, Завіна Ліза, Цярушкіна, Нямковіч Ц, Гурбо, Гапонін, Каплан.

Праўленне калгаса аказвае грашовую дапамогу калгаснікам, якія жадаюць набыць кароў. Вылучан спецыяльны чалавек для закупкі цёлак калгаснікам.

Калгасніцы добра зразумелі, што толькі пры совецкай уладзе, праз калгасы можна выйсці з галечы і будаваць заможнае жыццё.

Слуцкі раён. Я. Кучур.

Калгас „Новае жыццё" Слуцкага раёна. Сям'я калгасніка Сасноўскага пасля вячэры слухае чытку часопісі.

Старшыня калгаса „Кастрычнік", Парыцкага раёна, тав. ФРЫДКІНА

РАСЦЕ І ЎМАЦОЎВАЕЦЦА НАШ КАЛГАС

Наш калгас з'яўляецца амаль старэйшым калгасам у раёне—ён існуе з 1926 года. Калгас мае жывёлагадоўчы ухіл.

Вось як рос наш калгас. Пры арганізацыі яго было толькі трое коняй і 7 кароў. Зараз мы маем 94 штукі буйнай рагатай жывёлы і 25 коняй. Пабудавана пяць дамоў для калгаснікаў і клуб. Пабудован хлеў на 53 галовы, аборы і дзве цэментныя сіласныя паўвежы. У хлеў праведзена магістраль для механічнай падачы вады з артэзіянскай студні. У хлеве і канюшні ёсць электрычнае святло. Пачынаем будаваць ацеплены цялятнік на 40 цялят.

Дзякуючы разгортванню соцспаборніцтва паміж брыгадамі, мы ў гэтым годзе дагэрмінова скончылі веснавую сяўбу. Участкі былі разбіты па брыгадах. Сеялі добраякасным, ачышчаным насеннем радковай сеялкай. Скарыстоўвалі торф для ўгнаення. У выніку гэтага мы мелі вельмі добры ўраджай. Калі ў мінулым годзе сярэдні ўраджай збожжавых быў 4,6 цэнтн. з гектара, то ў гэтым годзе мы з гектара зняліі 12 цэнтн.—амаль у тры разы больш.

Убралі мы своечасова, без страт і датэрмінова здалі дзяржаве збожжа—з першага абмалота. Здалі своечасова бульбу. Таксама пастаўкі мяса мы ўжо выканалі і нават здалі 2 цэнтн. на 1934 год.

Усе сельскагаспадарчыя работы мы скончылі да Кастрычніцкіх свят.

Тав. Фрыдкіна.

Жыта засеялі 57 з пяловай га, замест 52 га па заданню. Паднята пад зяб 88 га — 100 проц. плана. Абмалацілі і размеркавалі ўраджай сярод калгаснікаў.

Калгаснікі атрымоўваюць на працадзень па 2 кгр. збожжа і 8 кгр. бульбы. Лепшыя ўдарнікі выпрацавалі па 600—650 працадзен і атрымалі па 75—80 пудоў збожжавых і па 300—325 пудоў бульбы. Сям'я Разанава (былога батрака) мае 650 працадзён і атрымала 81 пуд збожжа і 325 пудоў бульбы. Яцкевіч і Фрыдкіны маюць таксама па 600 працадзён і атрымалі па 75 пудоў збожжа і 300 бульбы. Гэта выпрацоўка за 10 месяцаў. За лістапад і снежань калгаснікі атрымаюць дадаткова па працадзнях.

Мы ажыццяўляем пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб забеспячэнні бескароўных цёлкамі. Выдалі калгаснікам 7 цёлак. Засталася без цёлкі толькі адна сям'я, якая нядаўна ўступіла ў калгас, але ў хуткім часе ёй таксама будзе выдадзена цёлка.

Створан ясельны фонд з усіх культур. На кожнае дзіця штодзённа адпускаецца з фермы 1/2 літра малака і 25 грам масла.

Нашы калгаснікі і калгасніцы прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Пазыкай ахоплены ўсе на 300 проц. задання, што складае 1400 руб. Усе маюць соцуклады ў ашчадкасу.

Я з'яўляюся парторгам у калгасе. Старшынёю калгаса працую ўсяго 1 месяц. Як члену праўлення калгаса і парторгу мне прышлося весці рашучую барацьбу з скрыўленнямі, якія былі ў былога старшыні калгаса Молокова. Ён прадаваў свінаматкі, прызначаныя для перадачы ў суседні калгас імя Калініна з мэтай укамплектавання фермы. Я рашуча паставіла гэта пытанне перад РК КП(б)Б і свінаматкі былі звернуты гэтаму калгасу.

Але ў нас у калгасе яшчэ ёсць недахопы, якія трэба знішчыць у самы кароткі час. Слаба разгорнута работа сярод жанчын, няма жанчын брыгадзіраў. Прыехаўшы з нарады, я яшчэ з большай сілай і энергіяй разгарну работу, каб яшчэ лепш умацаваць наш калгас, каб ён сапраўды стаў большэвіцкім, а ўсе калгаснікі заможнымі.

Выканаць рашэнне партыі і ўрада аб забеспячэнні цёлкамі бескароўных

Старшыня праўлення калгаса „1-я конная" (Менскі раён) Ігнарэ рашэнне партыі і ўрада аб забеспячэнні бескароўных калгаснікаў цёлкамі, корміць калгаснікаў толькі абяцанкамі. Пастанавілі даць 5 калгаснікам цёлак, а набыта ўсяго толькі адна. Нічога не робіцца для набыцця цёлак у калгаснікаў і аднаасобнікаў.

Праўленню калгаса неабходна прыняць усе меры для таго, каб у самы найкарацейшы тэрмін забяспечыць бескароўных калгаснікаў цёлкамі.

П. Л.

Менскі раён.

Сартаванне павышае нумарнасць Ільновалакна

План здачы трасты калгас „Расходна" перавыканаў. Адбіралі для здачы лепшую трасту. Зараз рэшту здаем Ільновалакном.

Спачатку мы не сачылі за ўсімі правіламі апрацоўкі ільна, не ахалоджвалі, кепска сартавалі і таму атрымалі толькі 8-мы нумар. Зараз нас вылучылі сартыроўшчыкамі. Мы абяцаем сачыць за ўсімі працэсамі ільноапрацоўкі і спадзяемся, што цяпер павязем на пункт лён не ніжэй 12 нумара.

Калгасніцы: Васілёнак Мар'я, Пашкоўская Ніна.

Сенненскі раён.

Новымі дасягненнямі ў справе разгортвання соцыялістычнай жывёлагадоўлі сустрэнем XVII з'езд ВКП(б) і XV з'езд КП(б)Б

МТФ калгаса „Гігант" стане узорнай

Калгас „Гігант", Баярскага сельсовета, мае МТФ, якая налічвае 93 дойных кароў і 56 галоў маладняка. На ферме працуюць самыя лепшыя ўдарніцы—калгасніцы. Яны змагаюцца за чыстату і парадак. Ліквідавалі абязлічку і наладзілі ўзорны догляд за каровамі. Загадчык фермы Жолудзеў яшчэ з самай вясны ўсіх сваіх кароў разбіў на чатыры групы і вылучы ў адказных за кожную групу. Па яго ініцыятыве ўведзена аплата работнікам фермы не ад галавы, як гэта было ў мінулыя гады, а ад велічыні ўдою. Кожная даярка ад надоенага літра малака атрымоўвае 0,02 працадня.

Старшая даярка Драбкова М. пільна сочыць за работай даярак. Яна заўсёды правярае, ці чыста абмываюць даяркі каровам вымя, ці чыста выдойваюць кароў і як яны кормяцца. З тых даярак, якія не змагаюцца за чыстату і якасць даення, Драбкова здымае працадні.

Дзякуючы такой пастаноўцы работы, калгас „Гігант" заканчвае выкананне гадавога плана па здачы малака дзяржаве: калгасу трэба здаць 45 650 літраў, а здадзена 42 328 літраў. Акрамя гэтага, калгас прадаў на калгасным рынку малочнай прадукцыі на 9 466 р. Усе выручаныя грошы скарыстаны на патрэбы калгаса.

Вельмі шмат увагі ў калгасе „Гігант" аддаецца выхаванню маладняка. Увесь маладняк разбіты на паасобныя групы: старэйшыя стаяць асобна ад цялят і пасвіліся таксама асобна. Пайльшчыца маладняка Новікава Мар'я добрасумленна яго даглядае, своечасова поіць добрым пойлам. Яна дабілася таго, што маладняк штодня папраўляецца.

Р. Канавалаў, Л. Пракаповіч.

Полацкі раён.

Якуціна Надзя і Барышова Марыля — лепшыя ўдарніцы жывёлагадоўлі.

У калгасе „Комсомольская праўда", кожны ведае гэтых лепшых ударніц. Яны пільна сочаць за кожным слабым парасём, пястуюць яго. Больш слабыя парасяты вылучаны ў асобныя групы і даглядаюцца лепей, чым здаровыя. У станках узорная чыстата. Падсцілка ў свінарніку мяняецца кожны дзень.

Дзякуючы прыкладнай рабоце, адыход парасят у брыгадзе Якуцінай і Барышовай меншы, чым ва ўсіх іншых брыгадах.

Мяжэвіч.

Аршанскі раён.

Адыхода на маёй ферме няма

У мінулым батрачка-пастушка, Будагоўская Ксеня Сяргеява цяпер загадвае свінагадоўчай фермай у калгасе імя Сталіна (Лазоўскі с/с, Клімавіцкага р.).

Мяне вылучылі на пасаду загадчыцы свінафермы, калі было толькі 5 свіней,—расказвае Будагоўская. Начамі я не спала. Калі пачаўся апарос, дамоў цэлымі днямі не з'яўлялася і дабілася, што адыхода маладняка ў мяне зусім не было.

Цяпер у нас ужо 14 свінаматак, 7 падсвінкаў, 104 галавы маладняка. Вясною было 12 апаросаў, якія далі 95 парасят.

Пабудавалі новы свінарнік.

У калгасе я з 1930 года працавала і ў полі, і ў лесе. Калгас люблю, як сваю родную сям'ю. Ды й сапраўды, калгас мяне прыгрэў, як родная матка. Выпрацавала я 202 працадні. Тры разы была прэміявана за ўдарную работу ў полі і за добры догляд жывёлы. Абута, адзета, маю бабульку—матку, якая ўжо не можа працаваць і жыве на маім утрыманні. Жывучы ў калгасе, мы ўжо забыліся пра ранейшае бядняцкае жыццё. Зараз я маю ў сваім асабістым карыстанні карову.

У нашым калгасе добра наладжана грамадскае харчаванне, добра працуюць яслі. Дзякуючы гэтаму ўсе жанчыны ўдзельнічаюць у рабоце.

С.

ДОБРА ДАГЛЯДАЮЦЬ

Шакевіч Проська і Малюкевіч Манька, працуючы ўвесь час на палявой рабоце, паказваюць вельмі добры прыклад, як у доглядзе за прымацаванымі да іх коньмі, так і ў перавыкананні норм выпрацоўкі.

Да іх былі прымацаваны горшыя коні. А цяпер толькі паглядзець — не адстаюць ад іншых у брыгадзе. У час перапынка яны ім дадуць і сена і травы, глядзяць, каб пачышчаны былі і напоены.

Галя.

Калгас „Маяк", Крычаўскі раён.

Няма гаспадарчага вока

Зіму калгас імя Молатава, Нова-Дворскага сельсовета, сустрэў непадрыхтаваным. Да гэтага часу не ўцеплены і не прыведзены ў належны парадак канюшня, кароўнік і свінарнік.

У канюшні не зроблен зашчытак, не пазатыканы дзіркі, няма столі, кругом дзме вецер, у сярэдзіне мокра, коні брудныя, не чысцяцца. Такое-ж самае становішча і з кароўнікам. Ён цесны, цёмны і мокры, бо знаходзіцца на нізкім месцы, Дзверы не ўцеплены, гной з пад кароў не вывозіцца. Свінарнік знаходзіцца ў антысанітарным становішчы, няма столі, вокны павыбіваны, у клетках не падсцілаецца і не чысціцца, свінні ляжаць у мокраце. Таксама ў свінарніку няма падруба і таму праз дзіркі лазяць сабакі і вылазяць свінні.

Свінарка Шостак Марыля нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. Корм, які даецца свінням, раскідаецца, большая яго палова валяецца ў гнаі. У выніку такой бяздзейнасці—вялікія страты маладняка і захворванне свіней. 21-га лістапада апарасілася свіння і ўвесь прыплод у ліку пяці парасят загінуў, бо не было ўстаноўлена дзяжурства.

Не гледзячы на ўсе гэтыя факты, праўленне калгаса імя Молатава да гэтага часу не прыняла ніякіх мер да іх знішчэння.

Лагун.

Менскі раён.

М. Сяднёў

ВОРАГ ЗЛОЎЛЕНЫ

(Апавяданне)

Ноч. Па небе бесперастанку паўзуць чорныя, як сажа хмары. Паўзуць грознай, нібы акамянелай сцяной. Нават вецер не мог разварваць, парушыць іхняй суцэльнасці. Ад гэтага яны засланілі ўсё неба. Здавалася, што вось-вось палье дождж і затопіць ўсё. Але дажджа не было, толькі была напружаная цішыня ды цемра.

У такі час Лазар Велькін варта ваў калгаснае са збожжам на таку гумно. Ліхтар, што свяціўся цмяным агнём, вісеў на ўбітым у сцяну коліку. Лазар, прытуліўшыся да сцяны, ні то драмаў, ні то перабіраў у думках даўно перажытыя вобразы. Ён ведаў, што хутка пойдзе дождж, таму яму можна будзе схавацца дзенебудзь у кутку і адпачыць. Але гэта думка адначасова і непакоіла яго таму, што ў час яго адпачынка вораг можа зрабіць шкодніцтва. Думаў, непакоіўся, а ноч усё чарнелася, як мокрая галка. Думаў і . . . заснуў.

* * *

За вакном пачуўся глухі шум дажджа. Платон павольна злез з печы, выкурыў сваю піпку і, не вымаючы яе з зубоў, вышаў з хаты. Чорная ноч яго нібы праглынула. Чорная ноч і шум дажджа яму цяпер спрыяюць.

Ён спакойна падышоў да гумна, паглядзеў на цмянае святло ліхтара, паслухаў роўнамернае дыханне Лазара, ухапіўся дрыжачымі рукамі за лату і, нэрвуючыся, палез на страху. Узабраўшыся за шчыт страхі, Платон паспешна пачаў разграбаць салому аж пакуль не прадраў дзіркі ў страсе, у якую ліў як з вядра дождж. Чуваць было, як на таку шуміць ад вады залацісты авёс.

* * *

Назаўтра, калі вятры кудысці далёка адагналі чорную навалу хмары, калі пачало світаць, Марта Седзіна—старшыня калгаса—ішла правяраць вартаўнікоў, каб даведацца, наколькі яны адданы сваей справе. Яна ведала, што вораг не спіць. І таму пільнасці паслабляць нельга.

Яшчэ здалёк Марта Седзіна заўважыла на сцяне забыты ліхтар. Сваімі быстрымі вачыма яна старалася адшукаць вартаўніка, але колькі не напружвала яна свой зрок, гэта ёй не ўдавалася. Тады яна павярнулася і, прайшоўшы некалькі крокаў, заўважыла пад паветкай, пабудаванай пры гумне, у дзіўнай постаці вартаўніка Лазара Велькіна. Ён моцна спаў. З маленькай яго галавы зляцела аблезлая шапка, нібы чакала свайго гаспадара.

Калі Марта кранула Лазара, ён раптоўна падняў галаву і, уставіўшы збянтэжаны погляд на знаёмы твар, застаўся нярухомым, як слуп. Марта тады запытала:

— Гэта ты так вартуеш?

Адказу не было.

— Ну, які-ж з цябе вартаўнік? Што гэта за нядбайнасць?

Лазар вінавата маўчаў. Марта рашуча павярнулася і стала адмыкаць гумно. Калі яна адчыніла вароты, яе нібы ў жар кінула. З-пад аўса, што ляжаў на таку, сачылася мутная вада. Марта злосна зірнула на Лазара. Яна зразумела у чым справа. Лазар адчуваў вялікую віну.

* * *

Па мокрай і бруднай дарозе ішоў у Райвыканком кулак Платон. У яго кішэні ляжала ўжо напісаная заява:

Старшыні Выканаўчага Камітэта.

Па нядбайнасці старшыні калгаса „Прамень" Седзінай прызначанае для насеннага фонда збожжа валяецца ў раскрытым гумне, у выніку чаго ўсё змокла і хутка зусім пагніе. Таму прашу Марту Седзіну прыцягнуць да адказнасці, як злачынца.

18|X—33 г. П. В.

Платон Вінчук, які дзейнічае заўсёды цішком, хацеў, каб якнебудзь адпомсціць Марце Седзінай за тое, што яна яму не пакарылася і пакінула ў яго службу, стаўшы актывісткай. Якжа яму не адпомсціць? Учора была галадранка, а сёння, глядзі—старшыня калгаса. Дзіўна! Яна ўзяла верх над тым, хто славіўся здаўна.

. . . . . .

З Райвыканкома Платон звярнуўся задаволеным, бо яму там абяцалі прыцягнуць Марту да адказнасці.

— А ўсё-ж такі я падмазаўся лоўка, мяне палічылі за разумнага калгасніка,—шаптаў Платон.

Кожны чалавек на сяле ведае, што Марта Седзіна калісці была батрачкай у кулака Платона, які, карыстаючыся яе працай, часта у дзікім шаленстве кідаўся да яе з кулакамі і біў да паўсмерці.

Людзі казалі:

— Божухна, што за мукі. Сірата, няма каму заступіцца.

Гэтак праходзілі яе гады, аж пакуль не паднялася на ногі. Стаўшы дарослай дзяўчынай, Марта паступіла ў комсомол, дзе шмат пазнала такога, чаго не ведала раней. Ішлі гады... Пачалася калектывізацыя і Марта першай уступіла ў калгас. Пасля стала старшынёй.

Людзі казалі:

— Накіруе, ажно нудна стане.

А Марта не спала цэлыя ночы, усе меркавала, як палепшыць калгасную гаспадарку. Аддавала ўсе свае сілы. Рабіла ўласнымі рукамі. Калгас набыў машыны, павысіўся ўраджай, адкрыліся яслі, жыццё калгаснікаў палепшылася...

І людзі гэта ўбачылі, адчулі. І людзі тады сказалі:

— З яе ёсць толк, гаспадар з яе добры.

Марта ў вачах калгаснікаў вырасла.

* * *

У канцылярыі адбываўся сход калгаснікаў. За сталом сядзеў прэзідыум: Марта Седзіна, калгаснік і прадстаўнік Райвыканкома. На стале перад імі ляжала усім вядомая піпка кулака Платона.

Гул хутка сціх і тады паднялася Марта Седзіна.

— Таварышы. Вы ведаеце, што за няпільную ахову калгаснай маемасці Лазар Велькін з працы знят. З прычыны яго нядбайства ўначы была прадзёрта страха, у выніку чаго замок авёс. Хто-ж гэта зрабіў?—запытаецеся вы. Гэта ўчынак яшчэ недабітага ворага—кулака Платона Вінчука.

Сход ужо ведаў, сход ужо крычаў:

— Давайце яго сюды. Вяжыце злую погань. Дух з яго вон.

— А вось тая піпка, якую ён забыўся, ці загубіў са спалоху,—гаварыла Марта. Яе знайшоў у саломе, папраўляючы страху, Апанас Дзянісаў. Платон Вінчук хітры. Ён хацеў замесці сляды свайго злачынства і таму падаў заяву у Райвыканком, каб мяне

Гл. канец на стар. 12 унізе.

Працаваць так, як працуе Аўраменка Ганна

Яшчэ задоўга да гудка работніца прадзільнага цэха Аўраменка пачынае збірацца на работу.

— Куды ты, Гануля, так рана сабралася, яшчэ да тваёй змены многа часу,—амаль кожны дзень кажа ёй сястра.

— Нічога, не рана. Яшчэ трэба ў сталоўку зайсці, ды і ў цэху падрыхтавацца да работы.

Ганна на скорую руку накіне на сябе свой рабочы халат і за 15 хвілін да пачатку сваёй змены яна ўжо ў цэху. Яна падрыхтуе шпулі, прынясе роўніцу з апаратнага цэха, прагледзіць свежы нумар цэхавай штодзёнкі, а часамі і допіс напіша да пачатку работы.

Ганна рэгулярна піша ў сваю цэхавую штодзёнку „За большэвіцкія тэмпы".

— У нас, у прадзільным цэху, дрэнна працуе рэдкалегія і на гэта зусім не звяртае ўвагі ячэйка і фабком. Напішаш допіс, а ён ляжыць некалькі дзён,—расказвае тав. Аўраменка.

Загуў гудок. Ганна ўжо даўно на рабоце. Яна пільна сочыць, каб не было брака, не дапускае дрэнных пачаткаў, глядзіць за правільнасцю нумара прадзіва. Аўраменка даўно ужо не ведае брака. Яна ўпарта імкнецца знішчыць брак не толькі ў сваёй чацвертай брыгадзе, але і ва ўсім цэху.

Ганна заўсёды ганьбіць бракаробаў, растлумачвае ім, што яны прыносяць шкоду прадпрыемству і сабе. Яе словы маюць вялікі уплыў. Прадзільшчыца Звяздоўская і прысучальшчык Шваеў, якія раней былі ўпартымі бракаробамі, сталі, у выніку штодзённага ўплыва Ганны, аднымі з лепшых рабочых па якасці і зараз у дагаворы па соцспаборніцтву яны ставяць першым пунктам: „знішчыць брак і даваць прадукцыю толькі высокай якасці".

* * *

Урачысты сход адкрыў старшыня фабкома. Ён доўга гаварыў аб якасці прадукцыі, аб выкананні прамфінплана, а потым паказаў на дошку гонара, на якой было прозвішча тав. Аўраменка Ганны і з гонарам гаварыў аб яе ўдарнай, прыкладнай рабоце ў цэху. Пры гэтым ён успомніў яе мінулае батрацкае жыццё. Перад усімі прысутнічаўшымі рабочымі яскрава паўстала, хто такая Ганна Аўраменка.

... Галоднае жабрацкае жыццё прымусіла Ганну пайсці шукаць сабе кавалак хлеба з ранняга дзяцінства. У 1929 годзе Ганна паступае на Якаўлевіцкую суконную фабрыку і становіцца лепшай ударніцай.

Цяпер, калі Ганна на ўрачыстым сходзе сядзіць у першым радзе залі клуба і глядзіць на чырвоную дошку, яна ўспамінае, як першы раз зайшла ў прадзільны цэх, як баялася тады шума і груката машын. Пасля крыху прызвычаілася. Гул машын стаў ёй блізкім і родным, роднымі сталі гэтыя шпулькі, роўніцы і ніткі.

Хутка Ганна аўладала тэхнікай работы, узяла тэмпы, знішчыла брак. Ужо некалькі год яна лічыцца лепшай ударніцай фабрыкі, лепшым барацьбітом за знішчэнне брака і за яўладанне тэхнікай.

Ганна глядзіць на чырвоную дошку гонара, дзе напісана:

„Аўраменка Ганна выканала прамфінплан у прадзільным цэху: першы квартал—103 проц., брак—0,4 проц., другі квартал—109 проц., брак—0, трэці квартал—112 проц., брак—0, кастрычнік—104 проц., брак—0, за дзесяць дзён лістапада—135 проц., брак—0. За перавыкананне прамфінплана, за зніжэнне сабекошта і знішчэнне брака Ганна Аўраменка заносіцца на дошку гонара".

Услед за выступленнем старшыні фабкома выступіў і дырэктар фабрыкі. Ён гаварыў коратка.

— Трэба так працаваць, як працуе тав. Аўраменка Ганна. Мы яе прэміруем ужо некалькі разоў.

У гэты вечар, прышоўшы з урачыстага схода, тав. Аўраменка прынесла да сябе на кватэру шмат прамтавараў—прэмію за ўдарную работу.

С. Мяжэвіч.

Аршанскі раён., Якаўлевіцкая суконная фабрыка.

Жонкі рабочых патрабуюць прыцягнення іх да работы ў вытворчасці

Нядаўна работніцы і жонкі рабочых сабраліся за шклянкай гарбаты. Даклады аб задачах вытворчага пахода імя тав. Гікало і аб выніках работы па Сталінскаму паходу прыкавалі ўвагу ўсіх.

Вельмі цікавымі былі выступленні жонак рабочых т. т. Столкер і Сімчык. Яны гаварылі аб тым, што ў вытворчай рабоце завода павінны прымаць удзел і жонкі рабочых. Жонкі рабочых могуць многа чаго дапамагчы заводу—на суботніках, парадамі свайму мужу. Выступаючыя прасілі, каб партарганізацыя і жанорг прыцягнулі іх да работы не толькі па бытавых пытаннях, але і па вытворчых.

Сход пастанавіў расставіць пасты работніц ва ўсіх брыгадах для праверкі ўзятых гэтымі брыгадамі абавязацельстваў. Работніцы абавязаліся выконваць прамфінплан па ўсіх паказальніках і здаць тэхэкзамен на добра.

Па пытанню аб сталінскім паходзе работніцы і жонкі рабочых прынялі выклік работніц і жонак рабочых завода „Комунар" на лепшае ўтрыманне кватэры. Ва ўмовы конкурса унесены наступныя пункты: захаваць чыстату кватэры, зараз пачаць рыхтавацца да засева агародаў, і ужо распачаць збор попела.

Кадышэвіч.

Менск.

ВОРАГ ЗЛОУЛЕНЫ (*Канец*)

прыцягнулі да адказнасці за злачынныя адносіны да аўса. Але не ўдалося, папаўся сам.

У канцылярыю ўвялі Платона. Сход дзесяткамі вачэй упіўся ў яго. Здавалася, рукі цягнуцца да яго, гатовыя задушыць. Сход думаў:

— Не. Брэшаш, паганае мяса, не схаваешся нідзе. Наш старшыня калгаса пад зямлёю ўгледзіць. У гэтым мы ёй дапамагаем, Седзіна не тая, не ранейшая, якой была ў цябе...

Вораг быў злоўлен.

Вынікі чысткі замацоўваюцца

Абутковая фабрыка імя Кагановіча за 10 месяцаў промфінплан выканала толькі на 91 проц. Гэта значыць недадала краіне 100 тысяч пар абутку.

Недавыкананне плана тлумачылася тым, што людзі на фабрыцы былі расстаўлены не на сваіх месцах. Асабліва дрэнна працаваў адміністрацыйна-тэхнічны персанал, не было чоткасці, канкрэтнасці ў кіраўніцтве, не сачылі за якасцю прадукцыі, нерашуча змагаліся і выяўлялі бракаробаў. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва было толькі на паперы.

Ударнікам мог быць усякі, хто запішацца. І не выпадкова, што пры праверцы соцспаборніцтва з былых 700 ударнікаў, сапраўдных ударнікаў засталося толькі 400.

Чыстка партарганізацыі абутковай фабрыкі выявіла ўсе гэтыя недахопы. У выніку рэалізацыі ўказанняў камісіі па чыстцы на фабрыцы маюцца значныя зрухі ў працы. Лепшыя адміністрацыйна-тэхнічныя сілы перакінуты зараз у цэх. Умацаваны кіраўніцтвам машынны цэх і новы канвеер. З радоў ударнікаў выкінуты лодыры, бракаробы. Заключаны індывідуальныя дагаворы па соцспаборніцтву, якія даюць вельмі добрыя вынікі. Вось напрыклад работніца Цярэшка выконвала прамфінплан на 94 проц., а зараз уключылася ў індывідуальнае соцспаборніцтва і выконвае план на 130 проц. Новадворская ніколі не выконвала промфінплан, а зараз заключыла дагавор на соцспаборніцтва і выконвае заданне на 101 проц. За другую дэкаду лістапада план на фабрыцы выканан на 104 проц. Палепшылася якасць прадукцыі.

Маецца зрух і ў наладжванні тэхвучобы. Раней на чале кіраўніцтва тэхвучобай фабрыкі стаяла Герасімовіч. Яна правальвала гэту работу з-за таго, што сама нічога не разумела ў абутковай справе і ў тэхвучобе наогул. Зараз умацавана кіраўніцтва тэхвучобай, і работніцы, якія наведваюць тэхгурткі, паспяхова авалодваюць тэхнікай сваёй вытворчасці.

Камісія па чыстцы выявіла дрэнную работу ЗРК, сталовай і дала цэлы рад указанняў па зніжэнню недахопаў. Зараз пастаўлена пытанне аб тым, каб у сталоўцы былі снеданні, гарбата, гэта ўжо праводзіцца ў жыццё. Забяспечылі бульбай рабочых на зіму, а таксама сталоўку гароднінай.

У галіне партмасавай работы і вучобы было выяўлена таксама цэлы рад недахопаў, якія зараз выпраўляюцца. Пераглядзелі работу партгрупоргаў, з імі праводзіцца штодзенная работа.

У вучобе галоўная увага звернута зараз на якасць яе. Адчыняецца партгабінет, дзе будуць рыхтавацца да заняткаў. Камісія па чыстцы адзначыла на дрэннае правядзенне жанработы на фабрыцы і адсутнасці кіраўніцтва комсомолам.

У комсомольскай арганізацыі зараз узмацнілася дысцыпліна, арганізаваны 4 маладзёжных ударных брыгад, і наладжваецца палітвучоба.

Але гэтыя дасягненні яшчэ зусім нязначныя ў параўнанні з тым, што можна зрабіць.

Рыхтуючыся да XVII партз'езда рабочыя абутковай фабрыкі ўзялі на сябе цэлы рад абавязкаў. Былі праведзены мітынгі і гутаркі, на якіх прапрацоўвалася пытанне падрыхтоўкі да XVII партз'езда. Рабочыя абавязаліся план 4-га квартала абавязкова выканаць на 100 проц., рашуча павысіць якасць прадукцыі, знішчыць брак да мінімуму, наладзіць добра тэхвучобу і палітвучобу.

Па-большэвіцку праводзячы ў жыццё ўказанні камісіі па чыстцы, калектыў абутковай фабрыкі безумоўна даб'ецца поспехаў на усіх вучастках сваёй работы.

Брыгада Гантман, Куніна.

РЫВА ФРЫД

Сакратар парт'ячэйкі 2-га агрэгата, 2-й змены ф-кі „Кастрычнік"

Замацуем дасягнутыя поспехі

Па вытворчаму паходу імя тав. Гікало і падрыхтоўцы да партыйных з'ездаў наша парт'ячэйка разгарнула вялікую масавую работу. Пасля агульна-агрэгатнага схода партгрупы разгарнулі па сваіх брыгадах растлумачальную работу. Зараз мы маем 6 брыгадных соцдагавораў і 175 індывідуальных самаабавязацельстваў з боку работніц і рабочых. Гэтыя абавязацельствы правяраюцца штодзенна вылучанымі па брыгадах тройкамі.

Ёсць у нас у ячэйцы добрыя комуністкі, якія на справе паказваюць адданасць партыі. Гэта работніцы Ідэльчык, Рубінская, Опенгейм, Зяленка.

Партгрупа, дзе парторгам з'яўляецца т. Зяленка, дабілася многіх дасягненняў. Прамфінплан у брыгадзе выканан па ўсім паказальнікам. Разгорнута масавая работа па грамадскім арганізацыям, як МОПР, АСО і ячэйцы Чырвонага Крыжа, якая да гэтага часу зусім не адчувалася. Вучобай ахоплены амаль усе рабочыя і работніцы. Праводзіцца чытка газет у часе абедзенага перапынка.

Па ініцыятыве трохкутніка брыгады былі абследаваны кватэры рабочых і работніц і тры кватэры адрамантаваны.

Не дрэнна працуе брыгада 8-га фасона, дзе парторгам з'яўляецца работніца Опенгейм. У брыгадзе добра наладжана дысцыпліна.

У новым наборы па вывучэнні тэхмінімума ёсць 15 работніц нашага агрэгата. Яны добра наведваюць тэхвучобу. Рэдка бываюць выпадкі, калі работніцы не наведваюць тэхгурткі. Пасля здачы экзаменаў лепшыя ўдарніцы будуць высунуты на вышэйшую кваліфікаваную работу, а таксама вылучаны на адміністрацыйна-гаспадарчую работу ў цэху.

Усе дасягненні і недахопы у рабоце агрэгата асвятлюцца у штодзенцы, якая нармальна выходзіць.

У далейшым нам неабходна замацаваць нашы дасягненні, яшчэ больш разгарнуць партмасавую работу, асабліва трэба будзе правесці дыферэнцыяваную работу сярод паасобных груп работніц.

Менск.

ДА З'ЕЗДАЎ КП(б)Б І ВКП(б) ПРЫЙСЦІ З ВЫСОКАЙ ЯКАСЦЮ ПРАДУКЦЫІ

Чырвонасцяжная швэйная фабрыка „Кастрычнік" з'яўляецца перадавой фабрыкай швэйнай прамысловасці БССР. Першую пяцігодку фабрыка выканала за тры гады, перавыканаўшы асноўныя паказальнікі, за што была ўзнагароджана Працоўным Чырвоным сцягам.

Высока трымаючы баявыя традыцыі барацьбы за выкананне плана першай пяцігодкі, фабрыка ў першым годзе другой пяцігодкі паставіла сабе асноўнай мэтай—палепшанне якасці прадукцыі і рост прадукцыйнасці працы.

Даць рабочаму спажыўцу, калгасніку, працоўнаму вопратку высокай якасці, якая задаволіла-б яго густ, узросшыя культурныя запатрабаванні—з гэтага пункта гледжання фабрыка „Кастрычнік" правяла перабудову тэхналагічнага працэса ў цэхах. Існаваўшая раней сістэма работы у цэху з вялізарнай істужкай у 110 чалавек (вытворчая адзінка), з вялікай колькасцю дробных аперацый, калі адзін рабочы ўшываў адзін рукаў, а наступны—другі рукаў (між іншым, густ работы у людзей розны)—не забяспечвала высокай якасці прадукцыі.

Пры перабудове работы былі арганізаваны ў агрэгаце невялікія брыгады ў 60—65 чалавек і аперацыі былі ўзбуйнены, што дало магчымасць рабочаму лепш апрацаваць сваю аперацыю. Уведзены дадатковыя аперацыі па прасаванні, ручная выметка палы, ручная мярэжка ніза падкладкі, замест мярэжкі спецмашынай.

Перабудова работы прывяла да ушчыльнення рабочага дня і палепшання якасці прадукцыі.

На аснове рашэнняў ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б на фабрыцы перабудавана сістэма кіраўніцтва агрэгатамі і брыгадамі. У агрэгатах ліквідаван інстытут інструктароў, за лік якіх узмоцнен кантрольны апарат і адміністрацыйна-тэхнічны персанал.

У мэтах узмацнення грамадскага кантроля за якасцю прадукцыі ў агрэгатах на кожнай 7-й аперацыі ўведзены грамадскія інспектары па якасці, якія кантралююць якасць 6 папярэдніх аперацый.

Тэхпрамфінплан—магутны вагар барацьбы за якасць прадукцыі

З першага кастрычніка гэтага года ўся вытворчая работа фабрыкі была пераведзена на тэхпрамфінплан.

Асноўным у тэхпрамфінплане з'яўляецца тое, што планаванне ідзе не зверху—ад трэста да брыгады, а наадварот—ад асноўнага нізавога звяна брыгады. Раней кантрольныя лічбы трэста некалькі разоў мяняліся на працягу гаспадарчага года, а цяпер, з пераходам фабрыкі на тэхпрамфінплан, запраектаваныя кантрольныя лічбы застаюцца ў сіле на ўвесь год. Пры ўвядзенні тэхпрамфінплана быў дэталёва вывучан кожны рух рабочага, яго машыны і на аснове гэтага былі выпрацаваны тэхнічныя нормы працы, зарплаты і выдаткавання сыравіны.

Тэхпрамфінплан з'яўляецца магутным вагаром павышэння прадукцыйнасці працы і мабілізацыі ўнутраных сродкаў фабрыкі.

Пры ўвядзенні тэхпрамфінплана была праведзена вялікая масавараслумачальная работа. У агрэгатах і брыгадах былі прапрацаваны планы, рабочыя актыўна абмяркоўвалі тэхпрамфінплан сваёй брыгады, уносілі свае прапановы і заўвагі.

У 1932 годзе толькі некаторыя брыгады былі на гаспадарчым разрахунку. З пераходам-жа фабрыкі на тэхпрамфінплан усе брыгады пераведзены на гаспадарчы разрахунак і плануюцца па ўсіх відах—па працы, фонду зарплаты, прадукцыйнасці працы і нормах хуткасці машын.

Ударная работа пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі забяспечылі выкананне прамфінплана першых трох кварталаў 1933 года. Выпуск прадукцыі за 9 месяцаў першага года другой пяцігодкі складае 18 мільёнаў 141 тысячу рублёў, супроць планавых 17 мільёнаў 971 тысячы рублёў. За 11 месяцаў вытворчая праграма на фабрыцы выканана на 102,3 проц. Прадукцыйнасць працы за 10 месяцаў 1933 года складае 106 проц.

Зніжэнне сабекошта за першыя два квартала складае 3,1 проц., супроць плана у 2,1 проц.

За тры квартала 1933 года паступіла 547 рацыяналізатарскіх прапаноў, з іх прынята 152. З ліку паступіўшых прапаноў 136 унесены работніцамі. Гадавая эканомія прынятых прапаноў—23624 руб.

Адным з лепшых вагароў у барацьбе за якасць прадукцыі з'яўляецца тэхвучоба. На фабрыцы „Кастрычнік" узорна пастаўлена тэхвучоба і тэхпрапаганда. Ёсць добра абсталяваны габінет техпрапаганды з трыма вучэбнымі агрэгатамі і 6 швэйнымі машынамі, ёсць бібліятэка. 94 чалавекі, з якіх 79 работніц наведваюць тэхнічныя гурткі. На занятках дэманструецца навучна-тэхнічны кінофільм „Швэйная машына".

Пры габінеце арганізавана вусная і пісьмовая тэхнічная кансультацыя. Дзякуючы разгортванню соцспаборніцтва паміж навучаючымися, заняткі наведваюцца на 100 проц. Вельмі зацікаўлены тэхнічнай вучобай работніцы і большасць з іх сапраўды добра паспявае.

ЦП саюза Швэйнікаў і Белшвэйтрэст выпусцілі ў верасні пазыку „За аўладанне тэхнікай, за якасць прадукцыі". Гэта пазыка мабілізавала кожнага рабочага на барацьбу за павышэнне тэхнічных ведаў, кваліфікацыі, за высокую якасць прадукцыі. Пазыка шырока распаўсюджана сярод рабочых і работніц фабрыкі.

Падрыхтоўка да партыйных з'ездаў, якая разгарнулася на фабрыцы, выклікала новую хвалю вытворчага энтузіязма сярод рабочых і работніц. Па-асобныя работніцы ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па лепшаму догляду машын і ахоце абсталявання, беражлівых адносін да сыравіны і фанітуры.

Лепшыя ўдарніцы

Тав. Голуб—рэдактар цэхавай насценгазеты 1-га агрэгата—працуе без брака. Праз сваю газету яна вядзе рашучую барацьбу з бракаробамі. У насценгазеце арганізован паказ вопыта работы старых кваліфікаваных рабочых, якія падцягваюць адстаючых.

Маня Гінзбург — прыкладная ўдарніца на вытворчасці, яна-ж

і сакратар комсомольскай ячэйкі. Яна сапраўды паказвае ўзоры работы ўсім комсомольцам. Тав. Гін·бург лепшая ўдарніца па тэхвучобе і лепшы стралок.

Вера Налецкая—зельмі добра аўладала тэхнікай сваёй работы, ніколі не дае брака і пераробак, яна ўважліва адносіцца да машыны. Прыходзіць на работу за 15 хвілін да гудка і прыводзіць у парадак рабочае месца, змазвае і чысціць машыну. Вось дзе сакрэт яе перамог, вось чаму яна дае добрую якасць прадукцыі.

Канчаткова ліквідаваць брак

Дзякуючы дасягненням фабрыка „Кастрычнік", уключыўшыся ва Ўсесаюзны конкурс, абвешчаны Галоўшвэйкіраўніцтвам СССР, на лепшае прадпрыемства і цэх, была прэміявана 7.000 руб.

Але ж побач з усімі дасягненнямі ёсць рад буйнейшых недахопаў—гэта пагоршанне якасці прадукцыі за лістапад месяц.

Пытанне якасці прадукцыі зараз стала асноўным ў рабоце парткома і фабкома. 7-га снежня на фабрыцы адбыўся адзіны партдзень і на ўсіх партгрупах абмяркоўвалася пытанне якасці прадукцыі. Пасля гэтага па цэхах адчуваюцца значныя зрухі. Усе сілы рабочых і работніц накіраваны на тое, каб змыць гэту чорную пляму, каб канчаткова ліквідаваць брак і пераробкі.

Згодна пастановы Ўсесаюзнага ураду ад 8 снежня выпуск недобраякаснай прадукцыі разглядаецца, як цяжкае, супроцьдзяржаўнае злачынства. Кіраўнікі трэстаў, дырэктары прадпрыемстваў і асобы адміністрацыйна-тэхнічнага персанала, вінаватыя ў выпуску недобраякаснай і некамплектнай прадукцыі, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці з прымяненнем меры судовай рэпрэсіі—пазбаўленнем волі на тэрмін не менш 5 год.

З гэтай пастановы кіраўніцтва фабрыкі павінна зрабіць адпаведныя вывады. Неабходна яшчэ больш узмацніць масава-выхаваўчую работу сярод рабочых і работніц фабрыкі, даць большэвіцкі бой браку і бракаробам.

Рабочы калектыў Чырвонасцяжнай фабрыкі „Кастрычнік" не аднаразова паказваў ўзоры большэвіцкай работы і зараз, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, рабочыя і работніцы выканаюць свае абавязацельствы перад партз'ездамі па датэрміновым выкананні прамфінплана 1933 г., давядзенні брака да 0 і тым самым дадуць краіне Советаў больш прадукцыі шырокага спажывання.

Арлова.

Канкрэтнымі справамі рыхтуюцца да партыйных з'ездаў

Рабочыя і работніцы чырвонасцяжнай фабрыкі „Кастрычнік" узмоцнена рыхтуюцца да XVII з'езда ВКП(б) і 15 з'езда КП(б)Б. Уся падрыхтоўка да з'ездаў увязваецца з вытворчым паходам імя тав. Гікало.

На мітынгах рабочыя і работніцы узялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў: выканаць гадавы план датэрмінова — да 28-га снежня 1933 года, давесці брак да нуля і пераробкі да 0,2 проц., наведваць партвучобу і тэхвучобу. Усе менш палітычна падрыхтаваныя комуністы і комуністкі абавязаліся да 17-га з'езда поўнасцю ліквідаваць палітнепісьменнасць; таксама беспартыйныя рабочыя і работніцы абавязаліся наведваць партвучобу, аўладаць тэхнікай сваёй машыны і аперацыі, арганізаваць у фонд XVII-га з'езда збор рацыяналізатарскіх прапаноў да складання тэхпрамфінплана 1934 года.

Закіпела работа у агрэгатах, брыгадах. Узнялася новая хваля соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Спаборнічае брыгада з брыгадай, партгрупа з партгрупай. Безліч індывідуальных самаабавязацельстваў, выкананне якіх штодзенна правяраецца вылучанымі тройкамі ў кожнай брыгадзе.

Ёсць перадавыя брыгады, якія амаль зусім не маюць брака, як напрыклад брыгада 3-га фасона, парторгам якой з'яўляецца тав. Шэйніна. Прамфінплан за лістапад выкаван на 104 проц. Пераробкі складаюць толькі 0,11 проц., замест узятых па абавязацельствах 0,2 проц.

Брыгада першага фасона, дзе парторгам з'яўляецца работніца т. Лось, прамфінплан выканала на 115 проц., пераробкі даведзены да 0,05 проц., брака амаль няма.

Комсомольскія групы, групоргамі якіх з'яўляюцца т.т. Чавуская і Жэбровіч, штодзённа перавыконваюць прамфінплан і амаль без пераробак і брака. Комсомольская група тав. Жэбровіч узяла шэфства над малапісьменнымі. Комсомольцы ходзяць да малапісьменных да хаты і займаюцца з імі па ліквідацыі малапісьменнасці.

Фабрыка „Кастрычнік" заключыла соцдагавор на датэрміновае выкананне прамфінплана 1933 года з фабрыкамі імя Кагановіча і Крупскай (Менск), „Профінтэрн" (Віцебск), „Комінтэрн" (Гомель) і імя Валадарскага (Магілеў).

У час вытворчага паходу фабрыка дабілася дасягненняў і ў справе палепшання сацыяльна-бытавых умоў работніц. Ударныя абеды павялічыліся з 150 да 350. Арганізован стол для узмоцненага харчавання лёгачным хворым на 30 чалавек, адрамантавана 35 рабочых кватэр і выдана 16 рабочым грашовая дапамога для рамонта кватэр у суме 3.000 руб.

На фабрыцы разгорнута вялікая масавая работа. Арганізаваны ўнутрыфабрычныя спаборніцтвы на права атрымання мандата на рапарт XVII з'езду ВКП(б) і 15-га з'езду КП(б)Б. Праведзен масавы вечар ударнікаў. Склікаецца канферэнцыя гаспадарча-разрахункавых брыгад, вядзецца падрыхтоўка да бытавой канферэнцыі бацькоў, дзеці якіх знаходзяцца ў яслях і садах. 25-га снежня на фабрыцы будзе праведзен міжнародны кангрэс нацыянальнасцяй. Кожны агрэгат вывучае эканоміку і становішча рабочага руху пэўнай краіны і выступіць з дакладам на гэтым кангрэсе аб становішчы рабочага класа данай краіны. Кангрэс будзе праходзіць у мастацкім афармленні.

Зараз ідзе падрыхтоўка да нарады старых і маладых рабочых і работніц. Таксама будуць праведзены нарады работніц па кваліфікацыях.

Брыгада: Эпштэйн, Цыркіна.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАБУДОВУ ДЗІЦЯЧАГА САДА ДЛЯ ФАБРЫКІ „КАСТРЫЧНІК“

Бытавыя ўстановы з'яўляюцца рашаючым фактарам ў справе ўкаранення жаночай працы ў вытворчасці. Яны даюць магчымасць работніцы па-ўдарнаму працаваць, удзельнічаць у грамадскай рабоце і вучобе. Асабліва рашаючую ролю ў гэтым адыгрываюць дзіцячыя ўстановы—яслі і сады.

У развіцці сеткі дзіцячых устаноў і палепшанні якасці іх работы мы маем за апошнія гады вялікія дасягненні.

Возьмем, напрыклад, менскую швэйную фабрыку „Кастрычнік“. Пабудаваныя тут ў мінулым годзе яслі ахопліваюць зараз 175 дзяцей, працуюць круглую пяцідзёнку і толькі ў шосты—выходны дзень маці забірае сваё дзіцё да дому. Гэтыя яслі забяспечваюць маці бесперабойную работу ў вытворчасці і даюць магчымасць удзельнічаць у грамадскай рабоце і вучобе.

Яслі вельмі добра абсталяваны. Дзяцей добра даглядаюць вопытныя кіраўнікі, якія іх выхоўваюць сапраўды ў комуністычным духу. Харчаванне добраякаснае. У яслях чыстата і ўтульнасць. Адчуваецца дбайная гаспадарчая рука загадчыцы ясляў.

Асабліва каштоўным з'яўляецца тое, што ў яслях ёсць 4 ізалятары па розных заразлівых хваробах. Ізалятары даюць магчымасць захаваць рабочую сілу на фабрыцы у той час, калі дзіця захварэе коклюшам, воспамі хваробамі і інш. Маці, пакідаючы дзіця ў ізалятары ясляў, спакойна працуе пры варштаце, бо ведае, што яе дзіця атрымоўвае належнае лячэнне і ўзмоцненае харчаванне.

Усё-ж трэба адзначыць, што гэтыя яслі яшчэ поўнасцю не ахопліваюць усіх дзяцей ясельнага ўзроста. Трохкутніку фабрыкі трэба заняцца пытаннем пашырэння ясляў.

Значна горш справа з абслугоўваннем дзяцей дашкольнага ўзроста. Свайго дзіцячага сада фабрыка „Кастрычнік“ не мае. Дзеці работніц раскіданы амаль па ўсіх садах горада. Штодзённыя клапоты з боку кіраўніцтва фабрыкі аб дзіцячых садах адсугнічаюць. У 7 дзіцячым садзе знаходзіцца 50 дзяцей работніц фабрыкі, што складае 75 проц. усіх дзяцей сада. Але гэты сад знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Ён не забяспечан харчамі, памяшканне цеснае і брудное. Ёсць вялікая запазычанасць бацькоў, што падрывае фінансавае становішча сада.

Фабрыка зусім не ідзе насустрач саду. ЗРК не адпусціў ні бульбы, ні гародніны і ніякай харчовай базы сад не мае.

На фабрыцы „Кастрычнік“, дзе работніцы складаюць 66 проц. усёй рабочай сілы, арганізацыя дзіцячых устаноў з'яўляецца асноўнай умовай для паспяховага выканання прамфіплана. Вось чаму паўстае неадкладная задача—пабудовы свайго дзіцячага сада на фабрыцы.

Саюзам швэйнікаў і Белшвэйтрэстам запраектавана ў 1934 годзе пабудова дзіцячага сада для фабрыкі „Кастрычнік“, для чаго адпушчана 40.000 руб.

Трыкутніку фабрыкі, Белшвэйтрэсту і Саюзу швэйнікаў неабходна ўжо зараз прыняць усе меры да таго, каб забяспечыць будаўніцтва сада матар'ялам і рабочай сілай.

Дзіцячы сад на фабрыцы „Кастрычнік“ у 1934 годзе павінен быць пабудаваны. За гэта фабрычныя арганізацыі павінны змагацца.

Менск. Копылева, Эпштэйн.

Лісты работніц і калгасніц

Тры гады будуюцца яслі, няма ізалятара

(*Ліст работніцы*)

Яслі фабрыкі „Дзвіна“ абслугоўваюць 70 дзяцей, у той час як дзяцей ясельнага ўзроста ёсць 250. Большая частка малых дзяцей пакідаецца ў хаце.

Новыя яслі будуюцца ўжо 3-ці год і ўсё ніяк не пабудуюцца. У тых невялікіх яслях, якія ёсць, няма ізалятара, у выніку чаго маткі часта бываюць вымушаны не выходзіць на работу, калі дзіця хварэе. Гэта вельмі дорага абыходзіцца прадпрыемству, бо калі ў час эпідэміі коклюша 30 дзяцей хварэе 30 дзён, то траціцца 900 працадзён. Акрамя прадпрыемства ад гэтага вельмі церпіць маці—ударніца вытворчасці і актывістка грамадскага жыцця, якой прыходзіцца сядзець дома і на якую ўсе глядзяць, як на прагульшчыцу.

Неабходна хутчэй знішчыць перашкоды ў рабоце. Яслі павінны быць тэрмінова скончаны і абавязкова павінен быць зроблен ізалятар. Фёдарава.

Віцебск, ф-ка „Дзвіна“.

Масавая работа адсутнічае

(*Ліст калгасніцы*)

Я калгасніца калгаса „13-ці-годдзе“, Цяплецкага сельсавета, добра памятую словы тав. Сталіна, што ключ да заможнага жыцця ў руках саміх калгаснікаў. Трэба толькі добрасумленна працаваць, добра апрацоўваць глебу, шанаваць сельскагаспадарчыя машыны, захоўваць калгасную маемасць, весці барацьбу з гультаямі і прагульшчыкамі, быць ударнікамі і мы напэўна станем заможнымі.

Я на ўборачнай была першай ударніцай. Не здаю пяршынства і на апрацоўцы ільна. Раней за ўсіх прыходжу ў еўню і па-сапраўднаму бяруся за мяцце. Таму перавыконваю нормы выпрацоўкі і даю добрую якасць. Па мне раўняюцца: Банькоўская Таццяна і Банькоўская Манька. Але ёсць і гультаі ў нашым калгасе. Вось Верабей Анюта і Андрыеўская гультуюць і не выконваюць нормы.

Дрэнна ў нашым калгасе тое, што не праводзіцца ніякай масавай работы, не організован гурток агратэхвучобы і мала зварачаюць увагі на ўдарнікаў. Насценгазета не выпускаецца.

Верабей Марта.

Уздзенскі р.

Сродкі супроцьхімічнай абароны*)

Прыстасаванне памяшкання пад газаўбежышчы

Акрамя супроцьгазаў для аховы ад атрутных матэрый служаць газаўбежышчы. Гэта такія памяшканні, якія захоўваюць чалавека не толькі ад атрутных матэрый, але і ад асколкаў бомб і снарадаў. Пабудаваць такія памяшканні для захавання ўсяго насельніцтва няма ніякай магчымасці. Для гэтага трэба было-б стварыць цэлыя падземныя цэментаваныя гарады.

Абараніць ад атрутных матэрый, а таксама і ад некаторых бомбавых і знарадных асколкаў, можа любое памяшканне пры ўмове, калі яно будзе адпаведным чынам абсталявана, што не патрабуе асаблівых выдаткаў. Найлепшым памяшканнем для аховы ад атрутных матэрый з'яўляецца тое, якое мае вельмі мала ваконнай плошчы і добрую герметычнасць, як, напрыклад, падвалы і пагрэбы.

У памяшканні, якое абсталёўваецца пад газаўбежышча, трэба перш за ўсё забіць пакляю і замазаць глінай усе шчыліны. Сцены і столь добра пакрываюцца цементаванай штукатуркай, а пасля штукатуркі маслянай фарбай. Дзверы і рамы вакон павінны быць шчыльна прыгнаны, шыбы ў вокнах добра закітаваны.

Каб шыбы вакон не трэскаліся пры разрывах снарадаў, іх трэба накрыж пераклейваць палоскамі паперы. Вокны павінны быць завешаны чым-небудзь шчыльным, устаўлены падвойныя рамы і зачынены акяніцы. Трэба, каб у кватэры абавязкова была патрэбная колькасць вады, а прадукты схаваны ў скрынках, або шафах. Пры такой герметызацыі атручанае паветра не зможа папасці ў памяшканне.

Трэба памятаць, што на аднаго чалавека для дыхання на працягу аднэй гадзіны патрэбуецца два кубаметры плошчы. Такім чынам, ведаючы плошчу кватэры, можна вылічыць, колькі можна у ёй захаваць асоб і на які час. Напрыкл д. кватэра мае 24 кубаметры. У такой кватэры на працягу аднэй гадзіны можа знаходзіцца 12 чалавек, або 6 чалавек на працягу двух гадзін.

Пры захаванні людзей вялікая ўвага павінна быць звернута на чыстату паветра. Нельга, каб у кватэры гарэла лямпа, а таксама забараняецца курыць, бо ўсякае гарэнне бярэ з паветра кіслародз, які патрэбен для дыхання чалавека.

У кожным такім памяшканні павінна быць аптэчка для аказання дапамогі пры няшчасных выпадках. У аптэчцы павінен быць шпігіляр, бензін, фенацэцін, эфірна-валер'янавыя кроплі, ёдная настойка, сода, піра ідон, марганца-кіслы калій, рашчына меднага купароса, вазелін, спірт, бінты, вата і зялёнае мыла.

У час хімічнага нападу трэба захоўваць спакой, бо ўсякая паніка толькі павялічвае ахвяры. Усе ходы па лесвіцах і калідоры павінны быць пад наглядам спецыяльна вылучаных людзей, каб у час хімічнай трывогі не было бегатні і беспарадка.

Кожны працоўны павінен вывучаць тэхніку аховы сябе ад атрутных матэрый. Толькі своечасовая падрыхтоўка дасць магчымасць зберагчы сябе ў час хімічнага нападу з боку ворага.

А. Маркавец.

*) Гл. часопісь „Работн. і Калг. Беларусі" № 2, 6, 16, 18, 19, 27, 29 за 1933 г.

Па слядах лістоў і допісаў:

У сваім допісе селькорка пісала, што ў калгасах „Іскра", „Верная праца" і „Чырвоны бор", Бяседавіцкага сельсавета, Касцюковіцкага раёна, агідна адносіцца да якасці апрацоўкі ільна, чым затрымліваюць хуткэйшую здачу ільна валакна дзяржаве.

Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі" накіравала гэты допіс для прыняцця рашучых мер у Касцюковіцкую РКК-РСІ, якая паведамляе, што факты пацвердзіліся. За злачынныя адносіны да ільнотрасты, у выніку чаго траста псавалася; старшыня калгаса „Іскра" з работы зняты і аддадзены пад суд.

Па калгасах „Верная праца" і „Чырвоны бор" таксама прыняты адпаведныя меры і зараз сушыльні працуюць нармальна.

* * *

У адказ на надрукаваны допіс у № 20 нашай часопісі пад загалоўкам: „Таварыш Рахманаў спіць", Лоеўскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты, закранутыя ў допісе, адпавядаюць сапраўднасці. За нядбайныя адносіны да адкрыцця ясляў загадчык Райза Рахманаў атрымаў вымову. План па арганізацыі ясляў па раёну выкананы.

* * *

Допіс аб тым, што старшыня Багушэўскага сельпо ра-ам з крамнікамі займаюцца замазабеспячэннем, быў накіраван намі ў Аршанскую пракуратуру для расследвання і прыняцця адпаведных мер. Аршанская пракуратура паведамляе, што факт злачынства ў краме ўстаноўлен і вінаватыя ў самазабеспячэнні аддадзены пад суд.

* * *

У адказ на ненадрукаваны допіс аб тым, што былыя заводчыкі браты Ліўшыцы пралезлі на кіруючую работу—адзін у якасці загадчыка Урэцкага смалакурнага камбіната, а другі ў якасці загадчыка смалакурнага завода ў вёсцы Таль, Любаньскага раёна, Любаньская РКК-РСІ паведамляе, што класава-чужыя элементы з работы зняты і вінаватыя ў засмечанасці арцелі прыцягнуты да адказнасці.

1423.

Кошт асобнага нумару 10 кап.

За чыстату і санмінімум у сталоўках і хатах

Як змагацца з тараканамі

Барацьба з тараканамі і прусакамі ў сталовых і хатах адыгрывае вялікую ролю ў справе палепшання іх санітарнага становішча. Тараканы могуць знішчыць прадукты і брудзіць страву. Таму неабходна павесці самую шырокую барацьбу з тараканамі ў памяшканнях

Тараканы і прусакі выходзяць на спажыву выключна ўначы, а днём сядзяць у шчылінах і цёмных кутках. Больш за ўсё прусакі і тараканы любяць цеплыню, чаму і водзяцца заўсёды на кухні і ў сталоўцы.

Без стравы таракан можа пражыць 13—14 дзён. Усе меры барацьбы з тараканамі і прусакамі падзяляюцца на папераджальныя і знішчальныя.

Папераджальныя меры

Для барацьбы з прусакамі і тараканамі трэба ўсе шчыліны ў падлозе, столі, сценах і вакол кухні замазаць глінай, або цементам, каб не даць магчымасці ім дзе-небудзь хавацца.

Нанач з кухні пасля работы трэба выносіць усе прадукты, калі яны пакідаюцца ў кухні, то іх трэба так захаваць, каб іх не знайшлі прусакі і тараканы. Неабходна нанач добра закрываць ваду, бо прусакі яе вельмі любяць.

Знішчальныя меры

У барацьбе з тараканамі на першае месца трэба паставіць хімічныя матэрыі, якія ўжываюцца для апылення і апырсквання тараканавых гнёздаў, або ў форме атрутных прыманак.

Для апылення больш усяго ўжываецца фторысты натр у мешаніне з мукою, талькам або гіпсам (на 1 частку фторыстага натра трэба браць 1 частку мукі, талька, або гіпсу).

Прыгатаванай мешанінай у сталоўцы пасля работы апыльваюцца ўсе шчыліны. Тараканы, праходзячы апыленыя месцы, апыляюць свае лапкі, а потым іх аблізваюць і такім чынам атручваюцца.

Для апырсквання тараканавых гнёздаў раіцца ўжываць мешаніну, у склад якой павінна ўваходзіць 60 частак шпігінара, 9 частак карболкі і 31 частка газы.

Таксама для атручвання тараканаў можна змешваць 82 часткі цукра з 18 часткамі крэмняфторыстага натрыя і рассыпаць гэтую мешаніну па шчылінах.

Для знішчэння тараканаў можна ўжываць фосфар з салодкім цестам. На 100 грам салодкага цеста трэба браць 1—2 грамы фосфара. Добра размяшаўшы цеста з фосфарам, яго трэба раскідаць па кутках, дзе ёсць тараканы. Падохшыя тараканы адразу збіраюцца і спальваюцца.

З фізічных мер барацьбы вялікае значэнне адыгрывае вымаражванне памяшканняў. Тараканы вельмі баяцца холада і пры тэмпературы 7—10° гінуць.

Для знішчэння тараканаў газам ужываецца серны ангідрыд, які атрымліваецца ад спальвання серкі. Серка бывае ў палачках, кавалках і парашку.

Перад спальваннем серку ў палачках і кавалках для лепшага яе згарання расціраюць у парашок. Ад сярністага газа гінуць усе тараканы. Перад акурваннем усе шчыліны добра замазваюцца глінай, альбо заклейваюцца паперай. Для лепшага спальвання серкі да яе дадаецца салітра (на 25 частак серкі 1 частка салітры), калі салітры няма, тады серку перад запальваннем трэба крыху паліваць газай. Спальваецца серка на жалезных лістах. Пад жалезныя лісты насыпаецца слой зямлі на 3—4 сант. Гэта робіцца для таго, каб у час спальвання серкі не загарэлася падлога.

Пры акурванні на 10 кбм памяшкання трэба браць 1000 грам серкі. У час акурвання памяшкання трэба быць у супроцьгазе. Акурваць трэба ад 14 да 24 гадзін. Пасля гэтага памяшканне трэба добра праветрыць, а атручаных тараканаў змесці і спаліць.

У сучасны момант пры ЦС Асоавіяхіма БССР арганізавана аперацыйна-знішчальная станцыя, якая праводзіць работы па барацьбе з тараканамі і прусакамі.

Калгасніца і работніца, не дапускай, каб у тваёй хаце, або ў сталоўцы былі тараканы і прусакі, змагайся за чыстату сталовак і хат.

Маркавец.

Да ведама ўсіх рабселькорак

Селькорка Пухавіцкага раёна напісала заметку ў часопісь „Работніца і калгасніца Беларусі" і канчае гэту заметку, так: „Я баюся пісаць сваё прозвішча, даведаюцца і заб'юць".

Рэдакцыя папярэджвае ўсіх пішучых аб тым, што прозвішча аўтара ніколі не выкрываецца, але пісаць сваё прозвішча і адрас неабходна для рэдакцыі, бо ананімныя лісты (без прозвішча і адраса) не могуць быць скарыстаны.

ПАПРАЎКА

Па віне літпраўшчыка апошняя фраза ў заметцы „Лепшая за ўсіх брыгада Каржовай" у № 33 часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі", на 5 старонцы надрукавана няправільна. Замест „усе члены брыгады займаюцца ў тэхнічным гуртку", трэба чытаць—„у брыгадзе арганізавалі тэхгурток".

Адк. рэдактар Э. Шапіра

Выданне ЦК КП(б)Б

Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 63, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 2585 У ліку 14.650 экз. Менгарліт № 2549

Здана ў набор 12-XII—33 г. падпісана да друку 21-XII—33 г. У нумары 2½ арк., 124.200 друк. зн.

##3н//193438 (050)

1964 г.

ЧЗН//193438(050)

0000000 198 1 167